Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Беларуская First Lady ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 05 (2751) Год LIV | Беласток, 1 лютага 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Супакоіць сэрцы і душы

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

— Пан рэдактар, маем катэгарычную забарону выказвацца на гэтую тэму, — сказаў „Ніве" адзін з духоўных Беластоцка-Гданьскай епархіі, якога мы папрасілі адкрыцца на тэму супрацоўніцтва праваслаўнага духавенства са службамі бяспекі ПНР. Шмат, таксама свецкіх, асоб пасля публікацый на гэтую тэму ў „Выбарчай газеце" і „Жэчпаспалітай" пазбягае размоў.

Уся справа пачалася зараз жа да юліянскіх Каляд. Тады на старонках „Выбарчай газеты" мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава даў інтэрв'ю пад загалоўкам „Gra z bezpieką o życie Cerkwi". Газета м.інш. пыталася:

— Мы не бачылі вашай папкі ў Інстытуце нацыянальнай памяці (ІНП), але атрымалі э-мейл з інфармацыяй аб яе змесце ад аднаго з палітыкаў. Быццам бы бяспека зарэгістравала вас у лютым 1966 г. [у актах ІНП гаворка аб маі 1965 г. — М. Х.] як тайнага супрацоўніка з псеўданімам „Юрэк". Вы аб гэтым ведалі?

Мітрапаліт Сава адказаў:

— З'явіліся ў мяне нядаўна людзі з ІНП, каб мяне з гэтай нагоды распытаць. Не, аб рэгістрацыі я не ведаў. Я не быў супрацоўнікам сістэмы, толькі пакутаваў з-за яе таксама як іншыя.

Далей мітрапаліт заявіў, што сустрэўся з функцыянерамі СБ і „не прымаў ад іх ніякіх сувеніраў", а грошы як успамогу атрымліваў так, як і іншыя праваслаўныя епіскапы — з Установы па справах веравызнанняў. Прытым дадаў:

— Натуральна, магло мне ў час гэтых размоў штосьці вылецець, сказаў я можа якое лішняе слова. Калі я кагосьці гэтым абурыў, прашу прабачэння.

Адзін з працаўнікоў ІНП, які прасіў захаваць ананімнасць, сцвердзіў у размове з „Нівай": „Мітрапаліт Сава сам інспіраваў гэтую размову, бо ведаў, што СБэцкія матэрыялы выйдуць на святло".

У юліянскі Новы год „Жэчпаспалітая" пацягнула тэму. У дэталях апісала ход супрацоўніцтва з СБ цяперашняга першаіерарха Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Выйшла пры нагодзе, што даносіў ён на іншых духоўных (м.інш. на айца Юрыя Клінгера, манахаў з Яблачына, мітрапаліта Васілія, які, дарэчы, таксама супрацоўнічаў з СБ). Атрымліваў за гэта грошы. Аказалася таксама, што супрацоўнікамі СБ быў шэраг пасляваенных епіскапаў, сярод іх таксама цяперашнія члены Сінода епіскапаў, епіскапы Авель, Адам, Іерамія, Міран і Сіман.

У спецыяльнай заяве мітрапаліт Сава напісаў: „Я асабіста нікому не нанёс шкоды: Царкве, сваёй Айчыне — Польшчы, ні Братам і Сёстрам". Паставіў прытым пад пытанне верагоднасць справаздач працаўнікоў СБ, якія састаўляліся на падставе праведзеных з ім размоў. Дадаў: „Ведаю, што мая заява не задаволіць некаторых. Таму таксама як кіруючы Царквой прашу прабачэння за мае і нашага духавенства паводзіны ў адносінах да СБ". Калі гаворка аб прэсавых публікацыях, апіраючыхся на матэрыялы пад крыптанімам „Bizancjum" (ёсць таксама іншыя: „Monastyr" „Nadbużański" ды г.зв. папкі працы духоўных), епіскап Сава заявіў: „Успрымаю іх як атаку на жыццё Царквы, яе стабільнасць, якую стараюцца парушыць. Сатане не падабаецца спакой у Царкве".

У абарону мітрапаліта і іншых іерархаў, абвінавачаных у супрацоўніцтве, стаў падляшскі дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін (у ІНП ёсць акты аб яго рэгістрацыі як ТС СБ; сам ён аб супрацоўніцтве пярэчыць). Пачаткова склаў ён адпаведны заклік, пад якім у Нараўцы збіраў подпісы самаўраднікаў. З нашых інфармацый вынікае — насуперак прэсавым выказванням дэпутата Чыквіна — што не ўсе хацелі падпісацца. Сярод падпісантаў былі м.інш. бурмістр Бельска-Падляшскага Яўген Беразавец ды намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна.

— Наколькі ведаю, 80 працэнтаў з тых, каму паставіць свой подпіс запрапанаваў дэпутат Чыквін, адмовілася, — запэўніваў нас адзін з падляшскіх палітыкаў. Таямніцай застаецца, чаму дэпутат Чыквін не рашыўся абнародаваць гэты заклік, а сваю думку на гэтую тэму мае апублікаваць у ведзеным сабою штомесячніку „Przegląd Prawosławny".

Шэраг дзён мы прабавалі скантактавацца з дэпутатам Чыквіным. На жаль, ягоны мабільны тэлефон быў выключаны. Пазбягаў з намі размовы таксама доктар Кшыштаф Сыховіч, гісторык з беластоцкага ІНП, сааўтар публікацыі аб стаўленні духавенства да бяспекі ў 1945-1989 гадах, якая мае паказацца ў палове лютага ў Жэшаве ў тамашнім часопісе „Aparat represji". Між іншым анонс аб гэтай публікацыі стаў галоўнай прадпасылкай выклікання тэмы самім мітрапалітам Савам.

Спыталіся мы ў гісторыка праф. Яўгена Мірановіча ці былі для яго неспадзяванкай інфармацыі аб супрацоўніцтве праваслаўнага духавенства, між іншым і іерархаў, з СБ.

— Я не разважаю такіх інфармацый у катэгорыях эмацыянальных. Я як гісторык на падставе архіўных дакументаў прасачыў сітуацыю Праваслаўнай царквы і адносіны да яе польскай дзяржавы ад міжваеннага перыяду да 1948 года. Магу сцвердзіць, што Праваслаўная царква як незалежная арганізацыя ў прынцыпе не існуе ад трыццатых гадоў XX стагоддзя. Дэкрэт Прэзідэнта РП аб адносінах Дзяржавы да Праваслаўнай царквы адабраў рэшткі аўтаноміі. Учыніў ён міністра рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы найвышэйшым функцыянерам вырашаючым аб персанальных і арганізацыйных справах Царквы. Гэта быў практычна патрыярх над мітрапалітам. Ваявода ў адносінах да епіскапа меў большую ўладу чым мітрапаліт. Не было гаворкі аб якой-небудзь незалежнасці. Бывала, што сітуацыя здавалася быць гратэскнай! У 1939 годзе выдалі, напрыклад, пры вялікім уключэнні дзяржаўнага апарату, зборнік казанняў на кожную нагоду, якія духоўныя мусілі толькі вывучыць. Вайна ў натуральны спосаб спыніла гэты эксперымент. Пасля вайны мала змянілася. Аб тым, хто станавіўся епіскапам у Беластоку, не вырашала якраз царкоўнае асяроддзе. Дэкрэт прэзідэнта ад 1938

працяг ☞10

Фота Міры ЛУКШЫ

Мітрапаліт Сава ў спецыяльнай заяве напісаў: „...прашу прабачэння за мае і нашага духавенства паводзіны ў адносінах да СБ"

У банках ці ў слоіках? ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Перад беларускім насельніцтвам зноў паўстала паўзабытая праблема — дзе трымаць свае грошы: у дзяржаўных банках ці дома на кухні ў слоіках. І ў што іх рэалізоўваць. Пасля раптоўнага абвалу беларускага рубля людзі нібы з ланцуга сарваліся. Каля абменных пунктаў пачалі ўтварацца чэргі...

Калядныя сустрэчы з Беларуссю ☞ 3

Міра ЛУКША

Тутэйшыя вёскі (1) ☞ 4

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Праславілі Хрыстовае Нараджэнне ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

Музыка жыцця і Эндзі Уорхал (2) ☞ 12

Ганна КАНДРАЦЮК

9 770546 196000

У банках ці ў слоіках?

Неяк, яшчэ пару гадоў таму, старшыня Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Пётр Пракаповіч сімвалічна прагаварыўся. Прагаварыўся галоўны бухгалтар краіны з толькі аднаму яму ўласцівай шчырасцю і простасцю. На пытанне журналіста, у якой валюце найлепш трымаць свае ашчаднасці, ПП (прашу не блытаць з ППРБ), вінавата ўсміхаючыся, адказаў, што раіць лепш усяго падзяліць усе наяўныя грошы на тры прыблізна роўныя часткі і захоўваць іх прапарцыянальна ў доларах, еўра і расійскіх рублях. Слухаць трэба такіх шаноўных людзей!

Перад беларускім насельніцтвам зноў паўстала паўзабытая праблема — дзе трымаць свае грошы: у дзяржаўных банках ці дома на кухні ў слоіках. І ў што іх рэалізоўваць. Пасля раптоўнага абвалу беларускага рубля людзі нібы з ланцуга сарваліся. Каля абменных пунктаў пачалі ўтварацца чэргі. Попыт на заходнія купюры істотна ўзрос, у абменніках утварыўся дэфіцыт долараў і зноў з'явіліся так званыя валютчыкі. А ў магазінах, дзе прадаецца айчынная і замежная бытавая тэхніка, назіраўся сапраўдны ажыятаж. Хапалі ўсё запар без асаблівага разбору. Усе, хто меў на руках больш-менш значную суму ў беларускіх рублях пачалі ад іх тэрмінова пазбаўляцца, як кажуць „скідваць". Нацыянальны банк па прызнанні начальніка ўпраўлення інфармацыі Анатоля Драздова не чакаў вялікага попыту на замежную валюту пасля дэвальвацыі беларускага рубля. Чыноўнік заявіў, што Нацбанк спадзяваўся на адваротнае — што насельніцтва панясе здаваць долары. Але сталася ўсё наадварот.

Па тэлевізары ж першая асоба дзяржавы аўтарытэтна, з традыцыйнай упэўненасцю, пры тым досыць грэбліва, заявіла пра амерыканскую „зеляніну" (цытую): „Надзеюсь ціпер нікто не будзет пакупаць эці пустые бумажкі за две тысячы шэссот, цем более неізвесна, што с эцім доларам будзет ваабшчэ". У гэтых словах ёсць пэўная рацыя. Сапраўды, цяжка прагназаваць, што будзе з доларам ці еўра ў бліжэйшы час. Затое беспамылкова, не будучы фінансістам, можна прагназаваць, што станецца з беларускім рублём. Вартасць яго будзе зніжацца і надалей. Усе апошнія гады гэты працэс ішоў спакваля, часам крыху перапыняўся, але зараз адбылася сапраўдная дэвальвацыя — вартасць айчыннага рубля ўпала ажно на дваццаць адсоткаў. Дасведчаныя эканамісты кажуць, што для гаспадаркі такі шокавы абвал — гэта добра. А вось для многіх людзей, якія даверліва складалі беларускія купюры ў панчоху ці клалі ў банк пад працэнты... Канешне ж, дэвальвацыя, як і ўсё важнае ў нашай дзяржаве, была праведзена патаемна, у лепшых савецкіх традыцыях, як кажуць „без абвяшчэння вайны". Як заўсёды ў такіх справах, нехта, хто меў заранёў інфармацыю, добра пагрэў рукі.

Безумоўна, сусветны фінансавы крызіс не абмінуў, бадай, аніводную краіну. Але беларускія ўладныя мужы хіба адзіныя, хто гэтага крызісу не прызнае. Пра яго нават і гаварыць забаронена. Маўляў, няма ніякага крызісу і ўсё тут. Так, як некалі ў СССР не было сексу. Сексу не было, але дзеці нараджаліся. Так і тут. Крызісу няма, але кошты цэлы час падвышаюцца. Фінансавы абвал у Беларусі, зрэшты, значную частку нашага насельніцтва наўпрост не крануў. Як казаў адзін герой кінаказкі пра грошы: „Дробных няма, а вялікіх ніколі і не было". А тое, што, прыкладам, прадукты харчавання даражэюць (і хутка будуць самымі дарагімі ў Еўропе) ужо стала звыклым.

Пра вартасць айчыннага рубля яскрава сведчыць і той факт, што Беларусь — хіба адзіная на кантыненце краіна, у якой няма сваёй разменнай манеты. Прымаўка „капейка бераж рубель" з мінулага жыцця і даўно не актуальная. Зараз ураду за кошт крэдытаў з Міжнароднага валютнага фонду, Расіі і Венесуэлы ўдалося крыху стабілізаваць сітуацыю (праўда, эксперты падлічылі, што на кожным насельніку Беларусі вісіць доўг у памеры дзве тысячы долараў, так што разлічвацца давядзецца напэўна і наступнаму пакаленню). Але вярнуць крэдыт даверу насельніцтва дзяржаве ўдасца відавочна не хутка. Людзі па-ранейшаму будуць аддаваць перавагу перад дзяржаўнымі банкамі хатнім слоікам.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нашы ў Шанхаі

У „Ніве" ад 18 студзеня навейшага года Мацей Халадоўскі напісаў цікавы тэкст, але, на маю думку, у ім здаецца выступаць інтэрферэнцыя рэальнасці з віртуальнасцю — не ведаю, ці гэтая інтэрферэнцыя здарылася аўтару ці мо герою ягонага артыкула, Яўгену Чыквіну — і таму я спрабую ўнесці туды некаторыя дапаўненні.

Храму Агія Сафія, як мне здаецца, не пагражае атэістычная прафанацыя, бо ж ён, як ні глядзець, стаіць на еўрапейскай зямлі і занесены ў лік каштоўнейшых помнікаў культурнай спадчыны ЮНЕСКА. „Пагражае" яму затое вяртанне да той ролі, дзеля якой ён быў узведзены, значыць да ролі месца рэлігійных абрадаў. А вынікае гэта з росту мусульманскага фундаменталізму не толькі ў краінах Сярэдняй Азіі, але і ў Азіі Пярэдняй, значыць у Турцыі. Вось менавіта турэцкія вартавыя рэлігійнай традыцыі хочуць вяртання ў Агію Сафію мячэці, якая функцыянавала тут да паловы 1930-х гадоў, значыць, да часу, калі ў выніку пераходу турэцкай дзяржавы на свецкія рэйкі Агія Сафія стала музеем і раскрыла затынкаваныя раней хрысціянскія фрэскі. Аднак не толькі мусульмане хадайнічаюць за вяртанне Агіі Сафіі да культавай ролі, хадайнічаюць за гэтым і хрысціяне. Магчыма, што за новую ролю храма хадайнічаюць і нейкія атэісты...

Столькі наконт візантыйскай Агіі Сафіі, бо ў свеце ёсць яшчэ і іншыя вартыя ўвагі храмы. Вось стаў я лістаць старонкі сусветнага павуціння і трапіў на кітайскі лісток „Shanghai Star". А там на прывітанне мне паказалася выява царквы. Тэкст, які яна ілюстравала, паведамляў, што ў самім цэнтры Шанхая стаяць дзве царквы, у даны момант пустыя. Магло б здацца, што тыя храмы былі ўзведзены ў царскі час дзеля грунтавання царскай веры ў Юго-Восточном Крае, так, як гэта рабілася і ў нашым Северо-Западном Крае. Аднак не, цэрквы ў Шанхаі былі пабудаваны ў 1930-х гадах выхадцамі з Расіі.

Адкуль жа тых выхадцаў столькі апынулася ў Шанхаі, што яны здолелі пабудаваць там некалькі цэркваў? Пераехалі яны ў Шанхай з Маньчжурыі, з Харбіна. Сам горад Харбін заснавалі будаўнікі Транссібірскай чыгункі і ў пачатку першай сусветнай вайны горад налічваў каля сямідзесяці тысяч насельніцтва, у якім дамінавалі рускія і кітайцы. У выніку расійскай грамадзянскай вайны ў Харбін хлынула хваля ўцекачоў з Расіі, якіх лік перасягнуў дзвесце тысяч чалавек. Але далёка яны ад Расіі не ўцяклі. У выніку савецкага чыгуначнага пагаднення працаваць на чыгунцы дазвалялася толькі савецкім і кітайскім грамадзянам. Уцекачы ж з Расіі не хацелі прымаць ні кітайскага, ні тым болей савецкага грамадзянства. Частка з іх, праўда, затужыла па Расіі і вярнулася ў Савецкі Саюз, але амаль усе яны былі неўзабаве палічаны японскімі шпіёнамі...

У той час былі ўжо наладжаны дзелавыя сувязі між Харбінам і Шанхаем, адкуль расійскія дзялкі пастаўлялі ў Расію кітайскі чай. Вось і сталі перабірацца савецкія непрымірымцы бліжэй Усходне-Кітайскага мора; у Шанхаі назбіралася іх каля дваццаці пяці тысяч. Спачатку было ім цяжка, але з ходам часу запусцілі яны парасткі і на новай зямлі. Займаліся яны не толькі бізнесам, але і культурнай дзейнасцю, не забываючы і пра духоўныя патрэбы; у выніку ў найбольш прэстыжных месцах Шанхая выраслі цэрквы.

Ды і Шанхай з ходам часу станавіўся штораз бліжэйшым савецкім замежжам. Цяжка было жыць пад японскай акупацыяй, але невыносна стала пасля прыходу камуністычных войск. Амаль усё расійскае насельніцтва на парозе 1950-х гадоў пакінула Шанхай і праз бежанскія лагеры на Філіпінах расплылося па свеце. Апусцелі шанхайскія цэрквы...

Новыя гаспадары Шанхая знайшлі ім іншае прымяненне. У час г.зв. культурнай рэвалюцыі шанхайскім цэрквам пагражала разбурэнне, аднак нейкі з тамашніх актывістаў павесіў на іх вялікія партрэты Вялікага правадыра Мао і храмы ўцалелі; можна сказаць, што сам Мао захіліў цэрквы перад хунвейбінамі. Пасля ў цэрквах былі то зборачны цэх пральных машын, то французскі рэстаран.

Аднак у апошні час храмы апусцелі. З уладальнікам рэстарана была маланкава раскідана дамова на арэнду царквы і атрымаў ён нават за гэта кампенсацыю. Апытаныя чыноўнікі з расейскага консульства ў Шанхаі нічога не ўмелі сказаць наконт прычыны такой перамены. Адзін з шанхайскіх чыноўнікаў патлумачыў, што загад захавання сакральных помнікаў даўніны прыйшоў са сталіцы, з Пекіна. Калі ж не хадайнічалі за гэтакім вырашэннем справы маскоўскія чыны, то хто? Мне здаецца, што ў Пекіне задзейнічалі польскія дыпламатычныя работнікі пасля варшаўскай сеймавай інтэрпеляцыі.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Люстрацыйны авангард

Апошнім часам па прычыне журналісцкіх абавязкаў стаў я часта бываць у беластоцкім аддзеле Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП). Спрабаваў паразмаўляць з адным з працаўнікоў Інстытута — гісторыкам доктарам Кшыштафам Сыховічам. З'яўляецца ён сааўтарам публікацыі, якая неўзабаве пакажацца, а прысвечана яна супрацоўніцтву праваслаўнага духавенства са службамі бяспекі Польскай Народнай Рэспублікі і іх сочкі за прадстаўнікамі польскай Царквы. Незалежна ад запэўнівання аб спатканні і размове, доктар Сыховіч рабіў усё, каб да журналісцкага кантакту (значыць — майго, а затым і „Нівы") з ім не дайшло. Тым часам, паколькі я хацеў даведацца чаго-небудзь аб сваім размоўцы, натрапіў на штомесячнік „Debata", які выдаецца ў Ольштыне. Аказалася, што адным з аўтараў гэтага часопіса з'яўляецца якраз д-р Сыховіч. Піша ён аб пытаннях звязаных з матэрыяламі, якія належаць ІНП. У найнавейшым нумары апублікаваў ён тэкст пад загалоўкам „Parę złotych na wódkę i zagrychę" аб супрацоўніцтве з СБ Сакрата Яновіча. Справа гэта няновая; у свой час пісьменнік з Крынак сам з сябе прызнаўся да сувязяў са службамі. Заявіў тады, што робіць гэта, каб яму больш у гэтай справе не дурылі галавы. Аднак, пан Сакрат, не так лёгка пазбыцца хваста, у гэты раз у выглядзе люстрацыйнага авангарду, да якога належыць д-р Сыховіч і некаторыя з супрацоўнікаў „Debaty". У якасці „гіта" выцягнуў гісторык з беластоцкага ІНП дакументы аб тым, што пісьменнік з Крынак, тагачасны журналіст „Нівы" і адзін з заснавальнікаў Літаратурнага аб'яднання „Белавежа", напісаў 18 жніўня 1958 года ўласнаручнае абавязацельства ўключна са звычайна прынятым сказам: „Zobowiązuję się również zachować w tajemnicy fakt mojej współpracy, nie ujawniając nawet przed najbliższą rodziną". Д-р Сыховіч прыводзіць м.інш. ход сустрэч Сакрата Яновіча (TW „Kastuś"), хоць бы з Канстанцінам Майсенем. Спасылаецца тут не на службовую нататку самога пісьменніка, але на квартальную справаздачу аддзела II Ваяводскай камендатуры МО СБ. Прыводзіць быццам бы — здаецца, абсурдныя — словы Канстанціна Майсені (1961 г.), які меў „Кастусю" запрапанаваць стварэнне нелегальнай беларускай арганізацыі двоечнай сістэмы, паколькі „ў недалёкай будучыні выбухне вайна і беларускі актыў павінен лічыцца з неабходнасцю вядзення падпольнай дзейнасці". Дарэчы, шмат з іншых дакументаў, якія прыводзіць д-р Сыховіч, не паходзіць з нататак Яновіча (руплівага супрацоўніка СБ — як гэта акрэсліў гісторык), але з запісак функцыйных працаўнікоў апарату бяспекі, якія таксама за час супрацоўніцтва пісьменніка выкарыстоўвалі іншых TW да „пільнавання" „Кастуся" (напр., даносы нейкага TW „Biebrza"). Доктар Сыховіч маргіналізаваў у сваім артыкуле факт спынення Сакратам Яновічам супрацоўніцтва з СБ, што, на маю думку, адносна маладога чалавека, было пачынам сапраўды геройскім у той час.

Пасля прачытання таго артыкула пазваніў я галоўнаму рэдактару ольштынскай „Debaty" Дарыюшу Ярасінскаму з пытаннем, чаму часопіс рашыўся на адагравание гэтага „катлета". Пачуў:

— Фактычна ў прынцыпе няма ў гэтым артыкуле нічога новага. Мы рашылі гэты тэкст апублікаваць, бо Сакрат Яновіч быў членам ольштынскага аддзела Саюза польскіх пісьменнікаў.

Дзіўнае тлумачэнне. Мяне здзіўляе факт, чаму якраз цяпер вяртаюцца да справы „Кастуся" амаль у той самы час з публікацыяй аб сувязях са службамі бяспекі ПНР прадстаўнікоў Царквы. На жаль, таксама гэтага пытання я не мог паставіць доктару Кшыштафу Сыховічу.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Калядныя сустрэчы з Беларуссю

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку і новапаўсталы Культурны цэнтр Беларусі знаёмяць Беласточчыну і Польшчу з культурай Беларусі. Ужо другі раз зімовай парой (12-16 студзеня) правяліся „Калядныя сустрэчы з Беларуссю". Найбольш народу, прагнага паслухаць родныя спевы і пабачыць народную беларушчыну ў найлепшым выкананні сабралася ў Беластоку 12 студзеня ў глядзельнай зале Вышэйшай школы фінансаў і кіравання па вуліцы Цеплай. Пазнаёміліся беларусы і нашы сябры з багатай выстаўкай вырабаў народнай творчасці, пабачылі паказ беларускіх народных касцюмаў, выкананых у цэнтры „Скарбніца" ў Мінску, і паслухалі добравядомыя песні гурту „Прымакі" з Гарадка. „Прымакі", як і шмат беларускіх калектываў з Беласточчыны — апрануты ў адмысловыя строі, запраектаваныя і пашытыя „Скарбніцай" (атрымалі яны ў гэты перадсвяточны вечар новую сцэнічную апратку, вельмі прыгожую і густоўную). Якраз касцюмы — і дакладна рэканструяваныя традыцыйныя беларускія строі, і сцэнічныя, і сучасныя, абапертыя на народнае мастацтва, прыцягнулі і захапілі найбольш гледачоў.

— „Скарбніца" — навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў, — расказвае Алена Жукава, вядучая паказ. — Яно ўжо больш за трыццаць гадоў вырабляе прадукцыю, якая ёсць візітнай карткай Рэспублікі Беларусь. Займаемся наступнай дзейнасцю: ручным ткацтвам, народным адзеннем, сцэнічным касцюмам, керамікай, пляценнем з саломы, роспісам дрэва, роспісам шкла, дызайнам інтэр'ера. „Скарбніца" рэканструюе традыцыйны беларускі строй, распрацоўвае стылізаваныя этнакалекцыі адзення. Нашы мастакі і майстры — прафесіяналы і знаўцы справы. На падставе старадаўніх беларускіх тэхнік ствараюцца ўнікальныя творы, у якія ўкладваем часцінку цеплыні і аўтарскай індывідуальнасці. Таксама прапануем навукова-метадычныя распрацоўкі паводле матэрыялаў, сабраных у экспедыцыях па Беларусі, ладзім выставы, майстар-класы і шмат іншага. Прапануем таксама наборы для вышыўкі для аматараў з тыповымі старажытнымі беларускімі ўзорамі, напрыклад: дрэва жыцця. Можна па гэтай схеме вышыць абярог сваімі рукамі: Параскеву-Пятніцу, сімвал Сонца. Да набораў далучана тлумачэнне і парады ад майстроў „Скарбніцы" як лепш вышываць.

На майстар-класах, якія вяліся ў Беластоку (у Культурным цэнтры Беларусі па вул. Модлінскай, 2), у Бельску (у Бельскім доме культуры), у Гайнаўцы (у белмузеі) і Гарадку (ГОК), моладзі і старэйшым працаўнікі „Скарбніцы" паказвалі, як плесці салому ды вышываць, падмацоўваючы практычныя ўмеласці зацікаўленых ведамі пра старажытныя беларускія ўмельствы. Вось тлумачэнне вышыванага сімвала дрэва жыцця: матыў дрэва жыцця ўласцівы для ўсіх міфалогій свету. Яно ўвасабляе жыццё ва ўсіх праявах і сустракаецца ў аздобе ручнікоў, вопраткі, посцілак. І невыпадкова — беларусы здаўна шанавалі дрэвы. Дрэва жыцця — гэта абярог, які засцерагае чалавека і ягоную маёмасць ад уздзеяння дэструктыўных сіл. Яно з'яўляецца таксама сімвалам сям'і і роду, бо звязвае жывых з памерлымі. Узорамі з дрэвам жыцця ўпрыгожвалі вясельныя падарункі. Часам ручнікі з ягонай выявай ахвяроўвалі ў царкву. Дрэва жыцця ілюструе спрадвечную канцэпцыю нараджэння, смерці і новага існавання і такім чынам сведчыць пра вечнае жыццё. Дрэва жыцця (ці сусветнае дрэва) звязвае чалавека з космасам. А вышываць абярог лепей шыўком „крыжык" ніткамі чырвонага і чорнага колераў у 2-4 складанні ў залежнасці ад памеру крыжыка. У камплекты для вышыўкі, прапанаваныя „Скарбніцай", уваходзяць схема вышыўкі, канва і ніткі.

— Мы з'яўляемся эталонным прыкладам, — дадае Алена Жукава, — паколькі мы займаемся не толькі прамысловасцю, але і навукай. Існуюць нашы прадстаўніцтвы і ў абласных цэнтрах, і ў меншых гарадах. На чым завязалася наша сяброўства? Мы пашылі строі для „Прымакоў". У мінскай „Скарбніцы" працуе чалавек 50, майстроў — 30. Усё ад пачатку да канца вырабляем самі. Спачатку займаецца справай лабараторыя мастацтвазнаўства, якую я ўзначальваю. Мы ездзім у экспедыцыі, збіраем матэрыял, абагульняем яго, пасля гэта дэманструем майстрам, часцей з нейкім каментарыем, а пасля майстры гэта глядзяць, мастацка апрацоўваюць і вырабляюць дакладную рэканструкцыю ці на падставе гэтага робяць сцэнічныя касцюмы або сучасныя мадэлі. Гэта майстры па касцюме, па ткацтве, па саломе, кераміцы... Выконвалі мы строі для хароў, ансамбляў (м.інш. для „Харошак"), для тэатраў (напрыклад, Віцебскаму драмтэатру для рэканструкцыі пастаноўкі „Несцеркі")...

Сучасныя модныя беларускі, другая справа — праектантка Алена Галіеўская

Дзяўчаты-майстрыхі на майстар-класах дэманстравалі сваё ўмельства і сачылі за мастацкімі спробамі асоб, якія прабавалі зрабіць першыя крокі ў саломапляценні і вышыўцы (некаторым удалося па ўзору зрабіць вельмі ўдалыя рукадзельныя вырабы), былі таксама мадэлямі, пад музыку прэзентуючымі традыцыйнае, сцэнічнае і сучаснае адзенне з чыста беларускімі матывамі. Праектавала сучасныя строі Алена Галіеўская — вядучы мастак-мадэльер цэнтра беларускіх народных рамёстваў „Скарбніца". Яна прадставіла публіцы маладзёжную калекцыю з лёну.

— Гэтая калекцыя не прамысловая, — расказвае Алена. — Яна была задумана як ідэя, адпраўны пункт для любых творчых людзей, у тым ліку і мадэльераў, і аматараў, якія робяць прыгожыя рэчы, вопратку для сябе і іншых сваімі рукамі. Маёй мэтай было паказаць вобраз, які б дазволіў уявіць традыцыйна беларускае праз сучаснае. Прадстаўленыя мадэлі — выдатны варыянт не толькі для сцэнічных выступленняў сучасных выканаўцаў, але і для звычайнай паўсядзённасці. Яны разлічаны на маладых дзяўчат, якія змогуць узяць штосьці адно з прадстаўленага асартыменту ў якасці этнічнай стыльнай дэталі для свайго маладзёжнага іміджа. Лён трох колераў — белага, шэрага і бэжавага, якія разнатонава падкрэслілі характэрную шматслойнасць і самой калекцыі, і яе прататыпа — народнага строю. Да апошняга ж адсылае і стылізаваная пад арнамент вышыўка з геаметрычным малюнкам шэрым, шэра-бэжавым і жамчужным шоўкам. Простыя лініі, строевыя чляненні, накладныя дэталі, стылізаваны фартух паверх штаноў і спадніц, рукаў рэглан, зборкі — такія рысы ў ільняных сукенках, штанах, брыджах, спадніцах і блузках. Да таго саламяныя арыгінальныя галаўныя ўборы — гледачы з Беласточчыны, асабліва моладзь, былі ў захапленні і на майстар-класах, прабуючы вырабляць аздобы з простай саломы ці беражліва вышываючы абярогі. Дзякуем! Да падзякі арганізатарам, спонсарам і беларускім майстрам далучаем падзяку ансамблям з Беласточчыны, якія ўключыліся ў „Калядныя сустрэчы з Беларуссю" — „Прымакам", „Жэмэрве" са Студзівод, „Асенняму лісту" і „Хутару" з Гарадка ды гуртам каляднікаў, што выступілі ў Гайнаўскім Доме Культуры. Гэта ж сапраўды — сустрэчы з Беларуссю!

Аляксандр Карачун — дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы і Міхал Аляксейчык — Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку

Конкурс „Пазнай Беларусь"

Калі вы цікавіцеся гісторыяй, культурай Беларусі, яе сучасным жыццём, калі вы актыўныя творчыя асобы, — прапануе вам удзел у конкурсе „Пазнай Беларусь" Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

Мэта конкурсу — папулярызацыя сярод маладога пакалення беларусаў у Польшчы ведаў пра культуру, гісторыю і сучаснасць Беларусі, садзейнічанне рэалізацыі творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі беларускай меншасці ў Польшчы, зацікаўленне грамадскасці праблемай захавання нацыянальнай самасвядомасці сярод беларускай моладзі ў Польшчы.

У конкурсе могуць прымаць удзел вучні, творчыя калектывы, гурткі навучальных устаноў у Польшчы ва ўзросце **ад 3 да 18 гадоў**. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца працы на беларускай мове (вітаюцца арыгінальнасць і творчы падыход да афармлення).

Намінацыі конкурсу маюць тры ўзроставыя катэгорыі: ад 3 да 6 гадоў (дзеці ўдзельнічаюць у конкурсе на лепшы малюнак), ад 7 да 12 гадоў, ад 13 да 18 гадоў. Па кожнай намінацыі вызначаюцца пераможцы па ўзроставых катэгорыях з прысуджэннем дыпломаў першай, другой і трэцяй ступені.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

— лепшы малюнак пра Беларусь (фармат А4 і А3);

— фотаздымак аб Беларусі (памер здымка ад 18х24 см і вышэй);

— літаратурна-паэтычны твор (апавяданні, вершы, замалёўкі і г.д.);

— сачыненне „Беларусь у гісторыі маёй сям'і";

— лепшая публікацыя аб Беларусі ў сродках масавай інфармацыі;

— распрацоўка сімвала конкурсу „Пазнай Беларусь".

Кожны ўдзельнік конкурсу адзначаецца ганаровым дыпломам, а пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца каштоўнымі прызамі. Падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца ў будынку Культурнага цэнтра Беларусі з запрашэннем СМІ, прадстаўнікоў Пасольства, беларускай грамадскасці. Для ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсу рыхтуецца канцэртная праграма з запрашэннем дзіцячага мастацкага калектыву з Беларусі і з удзелам творчых дзіцячых калектываў беларускай меншасці ў Польшчы. У выставачных залах КЦБ будзе разгорнута выставачная экспазіцыя з лепшых работ удзельнікаў конкурсу.

Прыняцце да разгляду матэрыялаў — **да 15 красавіка 2009 г.** Да 30 красавіка 2009 г. — падвядзенне вынікаў конкурсу. Аб выніках конкурсу і месцы ўрачыстага падвядзення вынікаў настаўнікі і вучні будуць папярэджаны загадзя.

Конкурсныя работы можна дасылаць на адрас: Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы, вул. Модліньска, 2, 15-066 Беласток, тэл./факс 085 732 03 56.

Конкурс плануецца зрабіць традыцыйным і праводзіць штогод. З гэтай нагоды сёлета ўводзіцца дадатковая намінацыя — „Сімвал конкурсу «Пазнай Беларусь»" (адно першае месца).

(лук)

Святочны падарунак

Дырэктары сямятыцкага транспартнага прадпрыемства ПКС вырашылі далучыцца да дзейнасці Дзеда Мароза і абдорылі насельніцтва падсямятыцкіх вёсак своеасаблівым „прэзентам": на час калядных школьных канікул увялі святочны расклад язды аўтобусаў. І гэта зрабілі зусім неспадзявана, без папярэдняй інфармацыі. А гэта абазначае, што на працягу двух тыдняў многія вёскі былі пазбаўлены аўтобуснага транспарту. У іх ліку апынулася і мая вёска, з якой нельга было нідзе дабрацца: ані па закупы, ані да лекара ці аптэкі, ані ў царкву ці касцёл, не згадваючы ўжо аб больш далёкіх падарожжах з перасадкай у Сямятычах. Якія прычыны леглі ў аснову гэтай неразбярыхі — невядома. У інфармацыі на аўтобусным вакзале даецца толькі спасылка на рашэнне дырэкцыі, без прывядзення яго матываў.

Спрабаваў я даведацца, ці хаця на праваслаўныя Каляды паедуць аўтобусы цераз вёскі, але ў ПКС ніхто нічога не ведаў. На каталіцкія Каляды ў нас два дні выхадныя, то і так — як па суботах і нядзелях — абавязваў бы тады святочны расклад язды і аўтобусы па малых вёсках не ездзілі б. Але праваслаўныя Каляды выпадаюць у працоўныя дні і аўтобусы тэарэтычна павінны ездзіць. Толькі ці будуць? А мо ў дырэкцыі сямятыцкага ПКС працуюць экуменісты і палічаць нашы Каляды сваімі? Не дай Бог!

М. Ц.

Закон для багатых

З пачаткам года абавязвае новы закон аб падаходным падатку. Дагэтуль абавязвалі стаўкі 19, 30 і 40%. Зараз засталіся дзве: 18 і 32%. Кіруючая каліцыя заяўляла ўсім і паўсюду, што законам пакарыстаюцца найбяднейшыя. Праўда, аднак, іншая. Падатак, як вядома, плацім залежна ад сумы атрымліванай зарплаты. Для прыкладу: пры стаўцы 1000 злотых брута эканомім 5 злотых штомесячна, што складае 60 злотых у год. Калі б мы штомесячна зараблялі сярэднюю краёвую, г.зн. тры з паловай тысячы злотых, тады „капнула б" нам 27 зл. больш, што ў гадавым маштабе склала б суму 324 зл. Яшчэ больш эканомяць на новым законе тыя, хто зарабляе сем з паловай тысячы. Раней такі шчаслівец плаціў павышаны 40-працэнтны падаходны падатак. Паводле цяперашніх ставак заплаціць ён адно 18% і ў год атрымае 4 350 злотых больш. І якая тут, даражэнькія, справядлівасць?

Мне прыбавілі ў месяц дзевяць злотых. На харчовыя прадукты і лякарствы выдаю намнога больш. Не стану прыводзіць канкрэтаў сваёй дамашняй бухгалтэрыі, бо каго гэтая статыстыка зацікавіць, як зрэшты і сам лёс хваравітага пенсіянера.

Уладзімір СІДАРУК

Ухабісты кавалак

Ёсць у Гайнаўцы такі тратуар на адрэзку адной з галоўных гарадскіх вуліц — вул. 3 Мая, ад вул. Верабея да вул. Спартыўнай. Яго даўно не рамантавалі. Пліты на ім там-сям раструшчаныя, да таго ляжаць няроўна. А якраз тут па гэтай вуліцы знаходзяцца прафесійная школа ды вядомы музей кавальства і слесарства. У мінулым годзе ў Гайнаўцы паладзілі шмат тратуараў, а пра гэты ўхабісты, небяспечны кавалак забыліся!

(яц)

Тутэйшыя вёскі (1)

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Ранішні аўтобус у Малочкі прыязджае каля паловы восьмай гадзіны раніцы. На вуліцы ўжо царыць аўтакрама, каля якой група пакупнікоў. Пытаю пра солтыса.

— А вось ідзе вуліцай.

Пытаю гаспадара вёскі, ці знойдзе хвіліну часу для гутаркі. Але ён аднекваецца, што часу не мае, хаця не вельмі мне ў гэта хочацца верыць, бо ж у чацвер — бельскі і сямятыцкі тарговы дзень — калі б ён меў на галаве нейкія працаёмкія справы, то яго ўжо ў той час у вёсцы не было б.

Праўду кажучы, то можа солтыс і меў рацыю, што не хацеў са мною гутарыць. Бо від ягонай вёскі надта сумны — тут амаль усё з'яўляецца скансэнам, не відаць нідзе перспектывы, не відаць думкі скіраванай у будучыню. Вялікая калісь вёска патыхае заміраннем. І не толькі брук сведчыць пра забыццё Малочак вонкавымі мацнейшымі гэтага свету, але і выгляд хат паказвае, што амаль усе чалавечыя парасткі, якія тут пабачылі белы свет, перанесліся на іншы, больш ім ураджайны грунт. Крыху хат сяк-так дагледжаных.

Жанчына, што паказалася на халодную вуліцу, інфармуе мяне, што ў паасобных хатах жывуць найчасцей адзіночкі, што гаспадараннем займаюцца два ці тры гаспадары; трымаюць яны кароў і коней. Аднак ніводзін з гэтых жывёлаводаў не мае малочнага студзільніка, а гэта абазначае, што і ім наканавана згортванне іхніх гаспадарак.

У канцы вёскі, што з боку Жукоў, стаіць будынак пажарнага дэпо. На вялікі жаль, не ўмею даведацца, ці людзі яшчэ карыстаюцца тым будынкам, бо слядоў чалавечай прысутнасці вакол яго не відаць. Па найбліжэйшым панадворку адзінока лютуе сабака. І травою будынак дэпо не зарастае — магчыма, што тут пасвіцца час ад часу нейкая жывёла. Побач дэпо ёсць пажарны гудок ды на будынку кнопка да яго, але падазраваю, што апрача гудка іншыя супрацьпажарныя меры ў дэпо адсутнічаюць: у гараж немагчыма заглянуць, а ў прасторнай святлічнай зале — падлога. Шыбы — і ёсць, і няма...

Назад вяртаюся не вуліцай, а па загуменнай дарозе, з якой яшчэ лепш відаць вёску. Бо ж з таго прыкрытага ад вуліцы боку стаяць гаспадарчыя будынкі, асабліва клуні, да якіх бліжэй было адтуль з поля. І тыя вось збудаванні, у якія сяляне звозілі плён сваёй земляробчай працы, крытыя на розны лад: некаторыя чарапіцай, некаторыя шыферам, але большасць саломай. Можна сказаць, што з загуменнага боку відаць гісторыю Малочак, напісаную яе гаспадарамі за перыяд г.зв. камуны. Бо ж у нейкай адлегласці за вёскай пустуе і помнік колішняга сацыялістычнага нашага будаўніцтва — пусты жывёлаводчы будынак.

Побач дарогі, што з Малочак адыходзіць у бок Снежак, мучыцца пункт прыёму малака. Дах тут даўно не бачыў дахаўшчыка і збудаванне плача ад гэтага чорнымі слёзамі, якія ліюцца па адным з вуглоў. Не лепш выглядае і недалёкі прыдарожны крыж, на якім каляровыя стужкі выконваюць не так аздобную, як канструкцыйную ролю, звязваючы яго дзеля засцярогі перад развалкай. Палі за Малочкамі абрабляюцца, магчыма, што нейкімі вонкавымі земляробамі. Зямля тут здаецца быць ураджайнай, бо нават на валунах вырас не толькі мох, але і цалкам буйная трава...

Крыж у Малочках з боку Снежак

Снежкі выглядаюць не лепш чым Малочкі, тут таксама відаць згортванне некалі важнай вёскі. Ужо ў самім пачатку відаць, што і мясцовага солтыса таксама ахапіла прыгнечанасць, бо сваю шыльду ён не прыбіў да сцяны, толькі заткнуў за вадасцёкавую трубу. У Снежках працуе крама, якая нагадвае не надта мінулую эпоху, а дакладней — 1980 год. За прылаўкам пабачыў я седзячага прадаўца, а на крэсле побач акна ці то пакупніка, ці то папросту прадаўцовага субяседніка. На полках стаяла некалькі пакецікаў з кашамі і мукой, стаялі малалікія бутэлькі з пітвом, а ў халадзільніку красаваліся толькі тры пластмасавыя вядры з засоленымі селядцамі. Такі тут Еўрасаюз...

За Снежкамі большы комплекс помнікаў сацыялістычнага пераўтварэння вёскі. Там вецер гуляе па вялікай аборы ды меншым свінарніку. Амаль упрытык са стадоламі гібее прызабыты пункт прыёму малака, які няспешна зарастае травою і кустоўем. Крыху далей у бок поля красуецца будынак пажарнага дэпо. І тут не было гаспадара, які б заглянуў на дах, дзе некаторыя аркушы бляхі задумалі рэвалюцыю і сталі падымацца козырам, на іншых пасяўную заводзіць прырода, а сцены з белай цэглы сталі „загараць" ад зацёкаў. Не бачна там таксама, каб хто заглядаў і ў гараж ці святлічнае памяшканне. Дарэчы, боязна датыкацца да дзвярных клямак, каб тыя не адваліліся разам з дзвярмі і іхнімі рамамі...

Могілкі каля Снежак

Ад Снежак да Сасін паяўляюцца запушчаныя кавалкі поля. У пачатку Сасін заўважаю, што жанчына, якая вяртаецца з недалёкага ўчастка, спыняецца, каб не сустрэцца са мною, незнаёмым. Бо хто ж ведае, якія цяпер валацугі валочацца па вёсках, ці не прайдзісветы якія, што толькі і цікуюць, каб адбурыць ціхі вясковы народ. Але і я спыняюся і жанчына воляй-няволяй ідзе ў мой бок. І калі я загаварыў да яе „па-тутэйшаму", ёй быццам камень з душы зваліўся.

А я яе занадта і не распытваў, пацікавіўся царквою, на якой з купалаў стала аблазіць фарба. Калісь стаяла там іншая царква, аднак пасля адной са службаў прыслужнікі дакладна не пагасілі свечак і ад тых недагаркаў успыхнуў пажар і царква згарэла... А пасля я спытаў пра мясцовага бацюшку... Бо калі я быў там у 2002 годзе, людзі наракалі на сваю духоўную сітуацыю. Тады быў там малады бацюшка, якога маладая матушка не хацела жыць нават у раскошнай плябаніі ў адлеглай вёсцы, і настаяцель не быў са сваімі прыхаджанамі, толькі даязджаў да іх з Бельска. А святар састарэламу насельніцтву патрэбны бадай не менш чым лекар... Цяпер у Сасінах бацюшка старэйшы, які жыве побач царквы — людзям менш трывогі калі што здарыцца.

Вядома, што чалавек звяртае найчасцей увагу на тое, што само сабою кідаецца ў вочы, на нешта буйное, а на менш прыкметныя аб'екты не заўсёды хапае ўвагі. Вось і я ледзь прыкмеціў асаблівы аб'ект — буданчык, такі, з якога прадаюць на летніх фэстах марозіва ці адграваемыя каўбаскі. Заінтрыгавала мяне паднятая аканіца — мо гэта нейкі вясковы кіёск, падумалася спачатку мне. Зараз паднялася ў тое памяшканне пажылая жанчына з поўным вядром вады. Пабачыўшы маё здзіўленне, падышла да мяне і на ўпартай польскай мове патлумачыла, што яна там жыве. Яе хата згарэла і яна сама купіла сабе такое жытло, бо ўлады ёй у нічым не дапамаглі. Вось такі амаль казачны сюжэт, адно тая хатка не на курынай ножцы, толькі на гумавых колах...

Недалёка іншая пажылая жанчына паіла з калодзежа кароў. На маё здзіўленне, чаму не карыстаецца для гэтага вадой з водаправода, патлумачыла мне, што вада ў ейным калодзежы дабраякасная і часта нават набірае яе і сабе. Паінфармавала яшчэ мяне, што малако здае ў пункт прыёму, што ў Малочках.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Варта марыць

З трагічнага дня прайшло ўжо амаль дзесяць гадоў. Немагчыма сказаць, што ўсё памянялася за гэты час, бо некаторых кепскіх успамінаў немагчыма забыць, можна затое прабаваць жыць, думаючы пра будучыню.

Моніка Ягадзінская нарадзілася ў вёсцы Чыжы. Дзяцінства цяжка назваць стопрацэнтна шчаслівым, бо мама пакінула яе ў двухгадовым узросце. Засталіся бацька і каханая бабуля, якая аказалася самай лепшай апякункай ды сяброўкай. Яшчэ і брат, але вядома, што падлеткі жывуць па-свойму і маюць кола сваіх знаёмых. Моніка са сваімі сяброўкамі марылі, між іншым, пра тое, каб хутчэй стаць дарослымі, можа нават выйсці замуж, што абазначала таксама выхад з хаты. У выпадку Монікі хата была сінонімам недахопу мамы і бацькі, які любоў да дзяцей дзяліў з любоўю да рознага віду напіткаў.

— Помню, калі бабуля пашыла такую прыгожую, белую сукенку, — распавядае Моніка, — тады замарылася мне выйсці замуж і стаць у царкве ў такой белай сукні.

Шчыра кажучы, яшчэ дзесяць гадоў таму шмат было спялеючых дзяўчат, асабліва з маленькіх мясцінак, якім не марыліся вялікія, гарадскія ўстановы, вышэйшыя школы. Хацелася ім толькі стаць незалежнымі, будучы жонкай і мамай. Вялікая частка з іх прабавала здзейсніць свае ўяўленні, Моніка з сяброўкамі таксама, але вяртаючыся аднойчы з вайсковай часці пад Гайнаўкай — вядома, ад хлопца — ужо не дайшла дахаты. Радасць жыцця перарвала трагічнае дарожнае здарэнне. Штурхнуў яе самаход.

Доўгі час Моніка была непрытомная. Цела было паралізаванае. Ніхто не быў упэўнены якім шляхам пойдзе працэс выздараўлення і ці ўвогуле Моніка выжыве. Калі ўжо вярнулася прытомнасць і свядомасць, яна была бяссільная, бо цела не дазваляла ёй быць самастойнай. Пачаўся доўгі перыяд рэабілітацыі. Гэта быў таксама час, калі Моніка трапіла ў Дом сацыяльнай дапамогі ў Белавежы, дзе заняліся ёю медсёстры і... Багдан.

Калі я паехала ў Белавежу шукаць у ДПС матэрыял для артыкула пра позніх і шматкратных мужоў ды жонак, дырэкцыя накіравала мяне таксама і да маладога сужэнства.

— Ведаеце, — сказала спадарыня дырэктар, — яна па цяжкім, няшчасным выпадку, такая трагічная гісторыя. Але яе клопат узяў на сябе наш жыхар, Багдан. Можа варта пацікавіцца іхняй гісторыяй. Завяду вас.

Спачатку я пабаялася кантакту з імі. Гэта быў выклік іншага роду. Я мела прайсціся па калідоры і праз пару хвілін сесці ў пакоі з чужымі людзьмі. Яна пасля доўгага ачуньвання, пакрыўджаная жыццём; ён таксама з жыццёвым вопытам і вялікім пагаршэннем зроку. Абое абмежаваныя, фізічна, бо, як аказалася, псіхічна яны зусім здаровыя, а нават жыццярадасныя, у што некаторым цяжка паверыць. Прынамсі мне было цяжка, гледзячы ў вочы Багдану і на сядзячую на калясцы Моніку.

— Каб толькі не забракавала Багдана, — паўтарае Моніка. — Не ведаю, што без яго са мной было б.

Багдан, калі папаў у Белавежу, вельмі хутка наладзіў кантакт у першую чаргу з апякункамі, а пасля, дзякуючы ім, пачаў дапамагаць у рэабілітацыі Монікі. Чалавек з-за хваробы выключаны з грамадскага жыцця патрабуе ўвагі іншых, таму размовы Багдана з Монікай былі для яе лякарствам. Самым простым, чалавечым, але і неабходным. Багдан аказаў вялікую цярплівасць, зразуменне і сэрца.

— Я вельмі люблю памагаць, — кажа Багдан, — таму мыў, купаў Моніку. З часам сустракаліся пры каве, а нашы размовы квітнелі.

Упершыню пабачыліся ў святліцы, куды Багдан прыехаў іграць на акардэоне. Тады ён сам яшчэ не ведаў, што гэты дом стане таксама яго домам. Са зрокам было штораз горш, жонка яму здрадзіла, разышліся. Белавежа стала яму будучынёй і шчасцем. Аддаў сябе і сваё жыццё жанчыне, якая была пазбаўлена ілюзій, баялася нават марыць, але дзякуючы яму пачала жыць нанова.

Уваходжу ў іхні пакой. Маюць свой асобны. Не ўсім так выгадна, але сужэнствы жывуць асобна, дазваляюць на гэта ўмовы адрамантаванага пасля пажару дому. Моніка глядзіць на сонца, якое заглядае праз акно, а Багдан займаецца сваім хобі — працай з камп'ютарам.

— Маю тут, напрыклад, адвернутыя колеры, белы з чорным, таму магу лепш бачыць, — тлумачыць Багдан. — Дзякуючы таму магу цікавіцца графікай. Маю шмат праграм, праектую, рысую, у мяне мноства ідэй. Раблю тое, на што мне зрок дазваляе.

Каб не стамляць вачэй, Багдан мае таксама іншыя заняткі.

— Слухаю аўдыёкнігі. Магу нават цэлы дзень слухаць. Раней кніжкі чыталі мне апякункі, Іза, Аня, а зараз камп'ютар іх заступае.

— Часам разам глядзім фільмы, — дадае Моніка.

Не спыняюцца. Са светам кантактуюцца пры дапамозе э-мейла або мабільніка. Ездзіць цяжка, бо транспарт Монікі — складаная справа. Найлепш, каб была машына, але Багдан не можа вадзіць. Аўтобусам з каляскай таксама нялёгка, але запрашэннямі на святы або іншыя важныя мерапрыемствы карыстаюцца і пару разоў у год стараюцца выехаць.

— Без Багдана было б гэта немагчымае, — кажа Моніка. — Дзякуючы яму я ажыла, шмат у чым я яму абавязана.

Наўкола іх шмат неспрыяльных людзей. Ужо паспела пачуць, што Багдан ажаніўся з Монікай дзеля грошай. Моніка атрымала вялікую кампенсацыю, якой распараджаўся яе бацька. Пускаў аднак тыя грошы не там, дзе патрэба.

— Дзякуючы таму, што я зараз жонка Багдана, маю ўплыў на тыя грошы і можам выкарыстоўваць іх на свае патрэбы. Я ўжо адцярпела сваё, хачу зараз жыць так, як хачу, наколькі гэта, вядома, магчыма. І з Багданам.

Шлюб Багдана і Монікі Янкоўскіх для некаторых быў няспадзяванкай, іншыя здзіўляліся, яшчэ іншыя звычайна цешыліся. Для Монікі гэта было здзяйсненне мараў, якіх прынамсі ў яе некалькі. Адбыўся толькі грамадзянскі шлюб, бо Багдан не можа чарговы раз стаць перад Богам, але затое часта з ім гаворыць. Аднак была белая сукня, было вяселле і госці. Моніка паказала мне ўсе вясельныя здымкі, бо гэта дзень, у якім сапраўды была гордая. Ганарылася не толькі сукняй, але перш за ўсё сваім добрым мужам.

— Каханне трэба запрацаваць, трэба заслужыць, — каментуе іхні шлюб Багдан. — Гэта не было выпадковае, мы шмат часу перагаварылі, дапамагалі сабе. Я калісьці іграў на вяселлях, бываў на шлюбах і неаднойчы бачыў як пустой бывае прысяга маладых. Такая формула, якую трэба сказаць, а мала хто задумваецца над яе зместам. Мы шмат прайшлі і ўжо без сэнсу не хочам гаварыць.

— Я пражыла клінічную смерць, была ў гэтым „белым тунелі", таму зараз ведаю, колькі значыць жыццё і што трэба ўмець ім цешыцца.

— А пытаеце часам Бога, чаму так склалася ваша жыццё?

— Часам чалавек задумваецца над сэнсам, — кажа Багдан, — але мы абое моцна верым у Бога. Не мае значэння факт, што Моніка праваслаўная, а я каталік. Мы знаем жыццё і ведаем, што самы важны — чалавек. А не розніцы між людзьмі.

— Трэба верыць, — дадае Моніка.

Хаця кажуць пра вялікае шчасце, на якое не спадзяваліся, то ўсё ж такі маюць яшчэ мноства мараў.

— Гммм... я хацеў бы зайграць з чэмпіёнам свету па шахматах.

— А я мару пра дзіцятка... толькі маю яшчэ няўмелыя рукі, каб ім займацца. Хачу, каб рукі былі мацнейшыя і больш зграбныя.

Нараўка

Калядоўшчыкі

У Асяродку культуры ў Нараўцы (Гайнаўскі павет) 16 студзеня г.г. адбыўся II Гмінны агляд калядоўшчыкаў. Выступілі салісты, дуэты, групы калядоўшчыкаў са звяздой ды групы, якія падрыхтавалі спецыяльныя спектаклі са спяваннем калядак. Прыняло ўдзел многа каляднікаў, а прэзентацыі іх майстэрства аказаліся ўдалымі.

Гран-пры заваяваў хор белавежскіх леснікоў з дванаццаці асоб. Сярод фальклорных калектываў першае месца занялі стараляўкоўскія „Цаглінкі" (яны выступілі са звяздой ды ў кажухах і іншай цёплай вопратцы, з фанарамі ў руках) і другое — „Нараўчанкі" з Нараўкі. Быў і саліст — Марк Скамароўскі, якому журы прысудзіла спецыяльную ўзнагароду.

У катэгорыі дзяцей першае месца занялі вучні першых класаў, другое — вучні III „а" класа і трэцяе — вучні другіх класаў Комплексу школ у Нараўцы. Тут была і дзевяцігадовая салістка Вераніка Максімюк (яна спявала ды іграла на скрыпцы), якая заняла першае месца.

У катэгорыі моладзі першае месца заваявалі вучні V „а" класа, другое — дуэт Дзіяна Засім і Каміла Адамовіч ды трэцяе месца — вучні VI „б" класа Комплексу школ у Нараўцы.

Са спектаклямі і спяваннем калядак выступілі жыхары Дома сацыяльнай дапамогі „Спакойная прыстань" у Гарбарах, дашкольнікі з Нараўкі і Старога Ляўкова ды дзеці са школьнай святліцы ў Нараўцы. Усе былі вылучаны за свае выступленні.

На заканчэнне мерапрыемства ўдзельнікі-пераможцы атрымалі арыгінальныя дыпломы і грашовыя ўзнагароды. Хор белавежскіх леснікоў рашыў перадаць сваю ўзнагароду — 500 злотых — дзецям і моладзі з Комплексу школ у Нараўцы. За гэты вялікадушны жэст падзякавала ахвярадаўцам дырэктарка КШ Марыя Леўша і прыняла падарунак.

Семяноўка

Новы асяродак здароўя

У Семяноўцы (Гайнаўскі павет) здалі ў карыстанне новы будынак асяродка здароўя. Гэтым вельмі задаволеныя жыхары Семяноўкі і ўсіх бліжэйшых навакольных вёсак. Гэтага моманту яны чакалі даволі доўга! Да іх у Семяноўку адзін раз у тыдзень — па серадах — прыязджае з Нараўкі доктар Мікалай Вапа (ён шматгадовы кіраўнік Гміннага асяродка здароўя ў Нараўцы).

У новым будынку асяродка ёсць пакойчык для рэгістрацыі пацыентаў, пачакальня, лекарскія і працэдурны кабінеты, туалеты. Ля ўсходаў ёсць спецыяльны пад'езд для пацыентаў на калясках.

Дырэктар Самастойнага публічнага ЗОЗ у Гайнаўцы Рыгор Тамашук пабяцаў даць неабходнае медычнае абсталяванне. У дзень адкрыцця аб'екта аўтар гэтага допісу хацеў зважыцца і нічога не атрымалася — адкульсьці прывезлі і паставілі ў кабінеце папсаваную вагу! Вось такі пачатак!..

Апрача таго папярэдняга абяцання дырэктар СП ЗОЗ неўзабаве намераны арганізаваць у Семяноўцы г.зв. белую нядзелю. Маюць прыехаць сюды лекары розных спецыяльнасцей і зрабіць абследаванне ўсім ахвотным тутэйшым пацыентам і паставіць кожнаму дыягназ. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Карнавал у бельскай „тройцы”

— Чым вылучаецца наша школа сярод іншых школ у Бельску? — спытала Сняжынка.

— У нас інтэграцыйныя класы, — адказаў першы вучань, удзельнік конкурсу.

— Брава!!! — пахваліла вядучая. З боку публікі таксама пасыпаліся бурныя воплескі. Калі стала ціха, Сняжынка (у сапраўднасці спадарыня Анна Сарокін) яшчэ раз паўтрыла сваё пытанне:

— Падумайце, чым яшчэ характэрная наша школа?

— У нас беларуская мова, — адважна заявіў вучань.

Пасля маленькія конкурснікі паспяхова сказалі поўную назву школы: *Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы* ды назвалі імя свайго патрона Яраслава Кастыцэвіча. Прыемна пабываць на святах, дзе памятаюць пра свае беларускія карані і дзе з радасцю вітаюць „Зорку”. Я ад пачатку захапілася каляровай залай, з шарыкамі, ёлкамі і сонечнымі промнямі, якія ліліся з неба ласкавымі струямі на галовы вясёлай кампаніі. Ёлка ў тройцы — незвычайнае свята, гэта каляровы баль-маскарад. На кожным кроку мы сустракалі прынцэс, цыганак, чараўнікоў, індзейцаў, жывёлак, аваднёў. Вы пэўна здагадаліся, куды мы папалі?! Сапраўды, мы завіталі на карнавальную ёлку, якую з размахам наладзілі ў бельскай „тройцы”. Нашы героі — дзеткі першых, другіх ды трэціх класаў (у цэлым 212 навучэнцаў з 11 класаў), іх бацькі, госці, настаўнікі. Спачатку здавалася, што немагчыма запанаваць над такой непаседлівай грамадой.

* * *

Разам з настаўнікам Яраславам Падольцам мы завіталі ў клас для беларускай мовы.

Тут рыхтаваліся да выступлення наймалодшыя спевакі. Сёння яны пераапранулісся за каляднікаў. У калектыве больш за дваццаць дзяўчынак і хлопчыкаў. Гурт пакуль не мае сваёй назвы, затое мае густоўныя строі (глядзіце на здымку) і файны рэпертуар. Не дзіва — дзеткі працуюць пад кірункам Ані Фіёнік. Сёння яны заспяваюць „Хрыстка”, калядку, якую ў Вадохрышча спявалі ў Арэшкаве. Сама песня напамінае гучную дэкламацыю, завершаную заклікам-клёкатам. Пачаткова гэты абрад суправаджаў калядоўшчык, пераапрануты за бусла. Паслухайце слоў:

Панна Марыя
На прыстолі стояла.
Два крыжы трымала,
А трэтім кадыла.
Кадіэтэся людэ
Хто в цэркві будэ,
Богу свічку ставтэ,
А нам піруог дайтэ!
Клё-клё-клё!
Одчыняй панэ окно,
На тобіе хрыстка,
Дай нам пірожка!

Пані Аня Фіёнік спадзяецца, што вырастуцць з іх новыя салісты для этнагурту „Жэмэрва”.

Нядаўна нашы спевакі выступалі на калядным аглядзе ў Беластоку, дзе і захапілі сваёй шчырасцю і павагай да спадчыны.

* * *

— Усе чакаюць аднаго конкурсу, — кажа пані Галіна, мама першакласніцы Наталькі. Мова пра конкурс на самы цікавы маскарадны касцюм. Здаецца, гэтае спаборніцтва найбольш перажывалі матулі. У Бельску няма крамаў, у якіх можна пазычыць карнавальны касцюм. Увесь клопат яны былі вымушаны ўзяць на сваю галаву. Добра, калі хто ўмее шыць! Апошнія шукалі касцюмаў па сваяках і чужых людзях.

— А мой касцюм з Індыі, — заяўляе першакласніца, пераапранутая за індуску. Дзяўчынку парата́ваў дзядзька, які вярнуўся з падарожжа па Індыі.

— А я стварала касцюм з дапамогай інтэрнэта, — прызнаецца спадарыня Ала, мама першакласніка Патрыка. Хлапчук заўпарціўся быць піратам. Мама кінула ўсё і пачала шыць „нягжэчны” камплект, уласнаручна зрабіла макіяж-шрам. Пасля хлапец ганарыўся, калі апынуўся сярод пераможцаў.

Апошняя справа была па-майстэрску арганізаваная, без зайздрасці і плачу, якая забівае ўсе пазітыўныя памкненні. Я мела гонар працаваць разам з настаўніцамі ў камісіі, якая ацаняла касцюмы. Самай важнай справай аказалася вынаходлівасць вучня. Касцюм павінен быў вылучацца ручным выкананнем і пасаваць да характару дзіцяці. Мне запамятаўся касцюм Аляксандры Зіневіч, пераапранутай за „райскага птаха” і Ані Кароль — „хуліганкі”. Узнагароджаных было намнога больш, ды ўсе ўдзельнікі конкурсу атрымалі кніжныя ўзнагароды. Вядома, у класах нашых сяброў чакаў яшчэ адзін мегасюрпрыз — да іх меў завітаць Санта-Клаўс з падарункамі.

— Будзем удзячны, калі на старонках „Зоркі” назавеце нашых спонсараў, — прасіла нас дырэктар Вера Міхноўская. Усё мерапрыемства праходзіла пад яе пільным і добрым вокам, у дружным супрацоўніцтве з настаўнікамі і бацькамі. У гэтым месцы мы выконваем просьбу нашых бельскіх сяброў. Спонсарамі ёлкі выступілі: Рада бацькоў, Выдавецтва „Nowa Era”, Bank Spółdzielczy w Brańsku, Eurobank w Bielsku Podlaskim, SKOK Stefczyka. Свежыя елкі, як кожны год, падарыла „тройцы” Бельскае надляснічтва.

Ой забалявалі ў „тройцы” 20 студзеня г.г., пасля малых гулялі яшчэ вучні класаў 4-6 і гімназісты.

ЗОРКА
ФОТА ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міра ЛУКША

Юрок з Юраўлян

— Раз і хопіць! Адна кладка! —
Так юркова кажа матка.
Лушчыць зернейка юрчыха
І брыўцом ганяе ліха:
Як зірне, дык уцякае
Ліха ўсякае з ускраін
Юраўлянаў і Кундзіч.
Толькі юрчыху пакліч!
Кажа муж, юрок чарнявы
(Спінка мае колер кавы,
А карыцы-цынамону
Жывот колеру ягоны):
— Ты не юркай, не ляніся:
Нанясіся, насядзіся...
Нас, юркоў, тут будзе болей,
Усіх пракормяць лес і поле.
З зяблікамі, з вераб'ямі
Не зраўняюць вас тут з намі!
Хоць я важу з дваццаць грам,
Гонар маю! Не аддам!

Зося з першага „а” класа

— 16 —

Калі Баршчэўскі наведаў першы „а” клас, ён адразу пачаў заглядаць пад парты. Дырэктар рэдка заходзіў у клас, аднак вучні добра памяталі яго візіты. Мужчына заўсёды хацеў даказаць сваю моц і ўладу. У чацвер ён наведаў першы „а” па іншай прычыне. Клас намерыўся пісаць пробны экзамен на атэстат сталасці па матэматыцы.

— Жадаю поспехаў! — кінуў ён на прывітанне. — Хоць я тут па іншай справе. Давайце, праверым ці вы памянялі боты на тапцікі.

Увесь клас спалохаўся. Ніхто, здаецца, і не падумаў пра змену абутку. Апошні раз Зося мяняла чаравікі ў гімназіі. У ліцэі не было такой моды і яна была шчаслівая, што не трэба займацца глупствамі.

— Цікава ці ў вашым класе ёсць хаця адзін вучань, які прытрымліваецца школьных правіл?

Дырэктар стаў аглядаць ногі ліцэістаў. Ён не мог паверыць, што ніхто з першага „а” не меў тапцікаў.

— Ну, дык маем праблему, — знерваваўся Баршчэўскі. — У гімнастычную залу, дзе хочаце пісаць экзамен, вас не пусцяць у зімовых чаравіках. І як вы зараз сябе адчуваеце?

— Давайце пераложым экзамен на заўтрашні дзень, — прапанаваў Пеця.

— Няма такой магчымасці, — адказаў дырэктар, — мы падрыхтавалі ўсё на сёння.

— Маю добрую думку, — адазваўся Тамаш. — Мы пашукаем у школе фольгу і зробім сабе такія засцерагальнікі, якія надзяваюць на боты наведвальнікі шпіталяў.

Прапанова спадабалася амаль усім ліцэістам і ўжо на перапынку яны клеілі „лапцікі”. Той-сёй абмяняўся абуткам з сябрам з іншага класа. Адна Клара не вырашыла праблемы. Паводле яе, ніхто ў іх школе не меў для яе адпаведных туфлікаў. І, як адзіная асоба з першага „а”, яна не пісала экзамену.

Апошнія былі задаволены працай. Пасля ўсяго закалоту ліцэісты з’елі смятанавы торт ад Грушаня. На жаль, на наступны дзень іх чакаў прыкры сюрпрыз. Ля ўваходу ліцэістаў прывітаў настаўнік гісторыі. Спадар Іванюк меў асаблівую задачу: ён сачыў, каб усе ліцэісты памянялі абутак.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Жывая „RIMA”

Фота Бабёр

Перад дзевятай гадавінай існавання гурту „RIMA” вырашыла я пагутарыць з вакалістам гурту Андрэем Паплаўскім пра апошнія цікавыя падзеі ў жыцці гурту.

— За вамі важная падзея — канцэрт у прамым эфіры Радыё Беласток. Адкуль такая ідэя?

— Ідэю прыдумаў Андрэй Гжэсь, які пастараўся, каб урэшце „RIMA” трапіла на радыё.

— У час канцэрта прагучала большасць старых, вядомых песень. Чаму такое рашэнне?

— Сапраўды, паўстала праблема якія песні зайграць, ці новыя, ці старыя. Неяк перагаварылі і вырашылі прэзентаваць песні са старэйшых праграм, хаця не вельмі хацелі, бо гурт зараз іграе інакш, чым калісьці.

— Гэта быў канцэрт успамінаў ці можа штосьці такім чынам завяршаецца?

— Напэўна не. Вядома, што новых песень усе не ведаюць, але я быў за тым, каб паказаць, як было калісь, а як іграем зараз; зайграць напалавіну — старыя і новыя. Хаця большасць складалі старыя песні, то аднак, думаю, гэтую мяжу было відаць.

— У лютым звычайна адзначаеце гадавіну існавання гурту „RIMA”. Ці з гэтай нагоды сёлета рыхтуеце неспадзяванку ці можа канцэрт быў такім падарункам слухачам?

— Пакуль яшчэ мы не думалі пра неспадзяванкі, але калі ўдасца, то як штогод наладзім канцэрт у Гарадку. Аднак да канца яшчэ не ўсё вядома.

— Чакаем усе новай прадукцыі гурту. Ці новы год прынясе нешта новае?

— Думаю, што ў гэтым годзе запішам матэрыял, які ўжо аднойчы запісалі на студыі „Apollo Records” у Марыюша Харужага. Дыск павінен паявіцца ўжо ў мінулым годзе, але гукарэжысёр не думаў гэтага зрабіць, толькі хуценька пералічыў нашы грошы, а альбома як не было, так і няма. Вядома, што там ужо запісваць не будзем... а хацелі ў сваіх (Марыюш сам з Гарадка). Але, думаю, што альбом „Kalevala” пабачыць дзённае святло.

— У якім музычным напрамку ідзе зараз „RIMA”?

— Зразу кажу, што музыка напэўна не будзе вясёлая і лёгкая, будзе буры настрой з праблісками яснага неба, а гэта звязана з перажываннямі, якія спасцігалі нас у апошніх гадах.

— А хто піша тэксты і пра што Ты зараз спяваеш, якія тэмы Цябе кранаюць?

— Мае тэксты з’яўляцца можа 2-3 разы, апошнія песні на словы Купалы, Аркуша, Шведа... Гэта пра існаванне чалавека, пра жыццё.

— Чаго пажадаеш чытачам „Зоркі” як яе былы чытач?

— Рабіце сваё — мары здзяйсняюцца!!!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 5

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 1:

Жук, рыф, прыгода, рысунак, брат, бо, цмок, ой, ла, жанр, жарабя, праца, рытм, рыс, чыгунка, фон, дабор, спакой.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі **Габрысь Кузьмін** з Бельска-Падляшскага, **Агнешка Мароз, Аня Карчэўская** з Гайнаўкі, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Паўліна Раманюк, Аня Калінаўская, Аня Аўксянцюк, Эвеліна Артэмюк** з Чыжоў, **Юстына Тамашук, Ася Стоцкая, Агата Грыгарук** з Дубін. Віншуем!



ЗАГАДКА КЛЯНОВАЕ НЕПАЎТОРНАСЦІ

Павольна ішла Яна паркам, і сонца ціха спявала ў шэра-зялёных вачах.

Была восень, непаўторная восень. Ёй хацелася адпачыць, напіцца апошнім водарам знікаючага цяпла, проста растаць у гэтых алеях, дрэвах, купінах апалай, прыціхлай лістоты. І яшчэ адна думка цвяліла, настойлівым павуціннем лёгка казытала сэрца: магчыма, яна сустрэне... Аднак — не варта, не трэба так часта; і сумна-вясёлыя думкі адганяліся прэч, як адганяюцца іншым разам надакучлівыя птушаняты ад паркавай лавы, дзе залатая бабулька з маладым паглядам крышыць ім вечаровай выпечкі хлеб.

Але вечар, восеньскі вечар — толькі акрэсліўся, толькі набліжаўся. Таму так шчыра дыхалася ля ўлюбёнага клёна, так непасрэдна прасілася ў рукі абляцелае, адшамацелае лісце. Раптам кінуўся, зазірнуў Ёй у вочы з ахайна сабранай купіны ліст, зусім непадобны на іншых. Урэшце, усе яны былі непадобныя адзін на аднаго; але гэты маніў сваёй жоўта-зялёнай рознакаляровасцю, далоневай дакладна акрэсленай і адначасна ўнікальнай формай, прыцягальнасцю выразных, па-хуліганску шчыльна пераплеценых жылак.

— Які ж ты!.. — не заўважыла, як ціха прамовіла ўслых, нахіляючыся ды падымаючы сонечную сваю знаходку.

— Хіба на гэтым свеце можа быць яшчэ нехта, каму можна сказаць „Якая ж ты!..”? І гэтае стварэнне, гэты чалавек — ты, — пачулася раптам за спінаю. А яшчэ праз імгненне Яна свяцілася і гарэла, як гарэлі ўвесь гэты кастрычніцкі парк, уся бронзавая, п’янотная восень.

— Можа, — з пачуццём звыклае супярэчнасці адказала, паказваючы сваю спічастую кляновую знаходку. — Думаю, ты ніколі не зможаш знайсці абсалютна такі ж.

— А калі знайду, пацалаваць — дазволіш?

— Ну, па-першае, хіба на гэта трэба пытацца дазволу? А па-другое, у прыродзе нічога і ніколі не паўтараецца.

— Ты думаеш? — з лёгкай усмешкай, а хутчэй нават з вечаровым, загадкавым смехам Ён растаў у паркавых акварэлях, а праз нейкую хвілю — зноў стаяў побач, працягваючы дакладна такі ж кляновы лісток: колер у колер, кропка ў кропку, жылка ў жылку.

— Але як такое магчыма?! — не верыла сваім фантастычна прыгожым вачам. — Так не бывае.

— Як бачыш, бывае.

І быў той пацалунак — самым сапраўдным, восеньскім, хрызантэмным. Адзінае возера бачыла Іх; і плакала, бязгучна і прыгожа — ад шкадобы, што немагчыма захаваць няўлоўнае, ад радасці за тых, хто знаходзіць нарэшце так доўга шуканае, ад болю, што вецер і час замятае нават самыя дакладныя адбіткі на дарогах, пакрытых расплаўленым ліставеем.

Толькі на раніцу яны ўбачылі, калі выпадкова перавярнулі лісты на іншыя бакі, што былі яны, — абсалютна рознымі.

Ігар СІДАРУК

Праславілі Хрыстовае Нараджэнне

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Моладзь з калектыву „Капрыс” з бельскай „тройкі” выступіла з калядкамі на беларускай літаратурнай мове і заняла першае месца (дырыжор — Анна Вярцінская).

Масавае калядаванне дзетак і моладзі на сцэне, з улікам мясцовых традыцый, распачалося ў Гайнаўскім белліцэі звыш дзесяці гадоў таму і ўдала працягваецца ў гарадскім доме культуры. Ініцыятарамі калядавання былі гайнаўскія дзеячы гарадскога гуртка БГКТ, якія сталі суарганізатарамі мерапрыемства. Пазней падобныя мерапрыемствы з удзелам моладзі сталі ладзіцца ў іншых месцах нашага рэгіёна. Зараз нашы дзеткі ездзяць калядаваць нават у Варшаву і іншыя гарады. Сёлета ў Гайнаўцы, так як і ў мінулых гадах, побач дашкольнікаў і вучняў запланавана было калядаванне таксама дарослых асоб з беларускіх і іншых калектываў, якія мелі з’ехацца з цэлага нашага ваяводства.

Цэнтр калядавання застаецца ў Гайнаўцы

Павятовыя і ваяводскія агляды дарослых калядоўшчыкаў пачалі ладзіцца ў Гайнаўцы намнога раней і таму апошнімі гадамі праводзіліся нават па тры калядныя агляды. Іншыя гарады, якія сталі ладзіць падобныя мерапрыемствы, не могуць раўняцца з Гайнаўкай як па колькасці выканаўцаў, так і па разнароднасці калядак і калядных абрадаў. У час калядавання ўсе яго ўдзельнікі павінны ад душы славіць нараджэнне Збавіцеля, а ўжо цяжка раўняць узровень выступленняў калядоўшчыкаў на паасобных мерапрыемствах, бо на адных галоўную ўвагу адводзіцца артызму спеву (накіраваных да дзетак і моладзі), а на іншых — на захаванне аўтэнтычных традыцый (дарослыя праваслаўныя калядоўшчыкі выходзяць на сцэну ў зімовай вопратцы і са звёздамі, спяваючы без дырыжораў толькі мясцовя калядкі, бо так ад вякоў рабілі іх продкі). Хаця ў гэтым годзе ў Гайнаўцы не адбыўся павятовы агляд вясковых калектываў, мелі яны нагоду запрэзентавацца пазней.

— Ваяводскі агляд калядных груп ладзіцца 25 студзеня. Побач праваслаўных каляднікаў выступяць таксама групы каталіцкіх калядоўшчыкаў, хаця б з Ломжынскага павета. Павятовыя выступы праваслаўных каляднікаў адбываліся тыдзень раней. У гэтым годзе ў нядзелю, 18 студзеня, выпаў строгі пост, які папярэджвае Хрышчэнне Гасподняе і мы рашыліся не ладзіць павятовага мерапрыемства, — удакладняе дырэктар ГДК Андрэй Скепка.

Затое згодна з планам прайшлі „Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай”, ладжаныя для дзетак і моладзі аб’яднаннем „Любіцелі царкоўнай музыкі”, Дэканальным інстытутам праваслаўнай культуры і ГДК. Выступіла каля трыццаці калядных груп, а новы подых унеслі калядоўшчыкі з Бельска-Падляшскага, паколькі ў мінулых гадах яны не выступалі на гайнаўскай сцэне. Я звярнуў увагу на вучняў з калектыву „Капрыс” з бельскай школы № 3, якія, як адзіная група, выступілі з калядкамі на беларускай літаратурнай мове. Бельскія вучні з „тройкі” ўдала запрэзентаваліся перад публікай, паказваючы адметнасці калядак і адначасна звяртаючыся да беларускіх традыцый свайго рэгіёна. Маладыя калядоўшчыкі перад выступамі на сцэне расказалі як у гэтым годзе калядавалі па вёсках і як каляднікаў прымалі ў горадзе.

— У Ласінцы калядавала ў гэтым годзе пад 20 груп. Апрача дзетак і моладзі з нашага сяла прыйшлі таксама каляднікі з суседніх вёсак. Я калядавала з „Рамонкай”, каб сабраць грошы на нашы выезды. Аднак былі ў нас каляднікі, якія познім вечарам хадзілі па сяле, спявалі калядкі і ўвогуле не хацелі браць грошай ад людзей. Былі гэта маладыя выхадцы з нашага сяла, якія калядавалі толькі дзеля падтрымання традыцыі, — сказала белліцэістка Магдалена Дудзіч з гурту „Знічка”.

Традыцыя перамагла выпрабаванні

Фалькларысты звяртаюць увагу, што традыцыя калядавання яшчэ старэйшая за хрысціянства. Побач калядак, у якіх славіцца нараджэнне Хрыста, захаваліся ў нас свецкія калядкі пра маладажонаў ці бацькоў нованароджанага дзіцяці, у якіх бачны сімвалы часоў паганства. Некалькі гадоў таму расказаў пра іх на семінары ў рамках „Гайнаўскіх сустрэч з праваслаўнай калядкай” Дарафей Фіёнік са Студзіводаў. Канешне, хрысціянская традыцыя выцесніла паганскія матывы, а калядаванне са звёздамі наперакор усім складанасцям захавалася ў большай або меншай ступені па сённяшні дзень. Вельмі небяспечным было калядаванне пасля апошняй вайны, асабліва ў прыпушчанскіх вёсках, куды заходзілі ўзброеныя падпольшчыкі. Народная ўлада, якая нават забараніла абыходзіць палі з харугвамі і малітвамі, таксама крыва глядзела на калядаванне, якое замацоўвала прывязанасць да праваслаўя і веру ў Бога. Пазней, пасля ўвядзення ваеннага становішча, па вёсках хадзілі чуткі, што міліцыя будзе арыштоўваць калядоўшчыкаў, калі ноччу паявяцца са звёздамі. Аднак моладзь у асноўным не спалохалася пагроз і па сёлах выйшла масава калядаваць. Сёння, калі славіць Хрыстовае Нараджэнне можна не толькі па вёсках, лік наймалодшых калядоўшчыкаў усё ж памалу меншае. Добра, што многія вучні пад апекай настаўнікаў, дырыжораў ды інструктараў рашаюцца на выступы ў Гайнаўцы, Бельску ці Беластоку і такім чынам маладыя не пакідаюць славіць Хрыстовае Раство.

Належна ацанілі артызм і заангажаванне дзетак і моладзі

„Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай” адбыліся на працягу трох дзён, з 15 па 17 студзеня, і публіка мела нагоду пазнаёміцца з разнароднымі калядными творамі. Згодна з традыцыяй, усе вучні атрымлівалі падарункі, а конкурсныя пераможцы, што выступілі другі раз у час гала-канцэрта — узнагароды. Мерапрыемства распачалося з удалага калядавання дашкольнікаў, якія выходзілі на сцэну са сваімі апекунамі, а ўсе яны прыйшлі з бацькамі або бабулямі. Спеў наймалодшых выканаўцаў спадабаўся не толькі іх сямейнікам, але і ўсёй публіцы, якая бурна апладзіравала калядоўшчыкам. Выступленням вучняў падставовых школ, гімназій, сярэдніх школ, прадстаўнікоў праваслаўных прыходаў і гмінных установаў культуры таксама спадарожнічалі апладысменты. У асноўным, як на магчымасці вучняў-аматараў, каляднікі выконвалі свае творы на высокім мастацкім узроўні. Артызм спеву, сцэнічнае афармленне ў час выступаў дзетак і моладзі ды іх заангажаванасць станоўча ацаніла конкурсная камісія. Сярод дашкольнікаў першае месца занялі дзеткі з Прадшколля № 2 у Гайнаўцы; другое — Прадшколле № 5; трэцяе — Прадшколле № 3. Сярод вучняў падставовых школ першае месца заняў калектыў „Ранок” з Бельска (ПШ № 4); другое — каляднікі са школы ў Чаромсе і дзіцячы хор з Комплексу школ № 3 у Гайнаўцы; трэцяе — каляднікі са школы ў Дубінах і Комплексу школ № 2 у Гайнаўцы. З ліку маладзёжных калектываў (гімназіі і ліцэі) першае месца заняў калектыў „Капрыс” з бельскай „тройкі”; другое — „Знічка” з Гайнаўскага белліцэя і бельскія каляднікі з Комплексу школ № 3; трэцяе — бельскія белліцэісты. Сярод іншых калядуючых груп першае месца занялі сямейнае трыо з Макаўкі і моладзь са Студыі эстраднай песні з ГДК (другога і трэцяга месцаў не было). У катэгорыі прыхадскіх хароў перамог Маладзёжны хор са Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы; другое месца — маладыя харысты з Дзмітрыеўскага прыхода ў Гайнаўцы і Прачысценскага прыхода ў Бельску; трэцяе — Дзіцячы хор з гайнаўскага сабора.

Беларуская First Lady

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Прэзідэнтам Рэспублікі Кітай на Тайване ў 1978-1988 годах быў Цзян Цын-го, сын больш вядомага ў нас Чан Кай-шы. Жонкай прэзідэнта Цзян Цын-го была Цзян Фан-лян — гэта яе кітайскае імя і прозвішча па мужу. А ў дзявоцтве называлася яна Фаінай Вахравай.

Дзяцінства Фаіны

Фаіна Іпацьеўна Вахрава нарадзілася 15 мая 1916 года ў Екацерынбургу ў сям'і беларускіх выхадцаў, якія на Урал пераехалі з-пад Оршы. Яе бацька працаваў пуцявым абходчыкам на чыгунцы, пасля стаў работнікам Уралмаша. У сям'і Вахравых гаварылі па-беларуску. Аднак малая Фаіна нядоўга мела дачыненне з роднай мовай, яе бацькі рана памерлі і малой сіроткай стала апекавацца большая сіротка — Фаіны старэйшая сястра Анна. Падросшы, Фаіна прайшла курс Фабрычна-заводскага вучнёўства і ў свае 18 гадоў стала на працу токарам у ранейшы бацькаў завод Уралмаш. Там яна пазнаёмілася з юнаком Мікалаем Елізаравым...

Жаніх

Бальшавіцкая Масква як магніт прыцягвала ўсялякіх — не толькі камуністаў — рэвалюцыянераў з усяго свету, у тым ліку і кітайскіх. Вось і сярод кітайскай моладзі пайшла чутка пра набор ахвотных вучыцца ў маскоўскім Камуністычным універсітэце рабочых Кітая імя Сунь Ятсена. Гэтакім чынам у кастрычніку 1925 года ў Маскве апынуўся і Цзянь Цын-го, 15-гадовы сын Чан Кай-шы — аднаго з лідараў Гамінданa, партыі кітайскіх антыфеадалаў. Аднак вучыцца яму давялося ў Камуністычным універсітэце рабочых Усходу імя Іосіфа Сталіна, разам з Дэн Сяо-пінам, Чжоў Эн-лаем і Хо Шы Мінам; выкладчыкамі ў іх былі м.інш. Іосіф Сталін, Мікалай Бухарын, Андрэй Вышынскі, Георгій Дзімітраў. У красавіку 1927 года ўспыхнуў жорсткі канфлікт паміж кітайскімі камуністамі і Чан Кай-шы, які прагнаў іх са свайго атачэння. Сын апошняга, пасля двух гадоў індактрынацыі, абурыўся на бацьку, асудзіў яго публічна, адрокся ад яго, заявіў сваю адданасць камуністычнай справе, прыняў савецкае грамадзянства і памяняў імя з прозвішчам, назваўшы сябе Мікалаем Уладзіміравічам Елізаравым (імя было ўзята з ранняга псеўданіма Уладзіміра Ільіча Ульянава — Мікалай Ленін, і „отчество" ўзяў ён ад Леніна, а прозвішча ад Ленінавай старэйшай сястры Анны Ульянавай-Елізаравай, у якой ён пачаткова жыў на кватэры). У пазнейшы час ён вучыўся ў ваенным вучылішчы, працаваў на заводзе, пасля ў ліку „дваццаціпяцітысячнікаў" (энтузіястаў, пасланых у 1929 годзе на вёску дзеля насаджвання калгасаў) прымаў удзел у калектывізацыі і нават нейкі час быў загадчыкам калгаса ў Падмаскоўі. У 1932 годзе апынуўся ён у Свярдлоўску, ранейшым Екацерынбургу, дзе стаў камсоргам на заводзе Уралмаш, а ў 1934 годзе стаў рэдактарам фабрычнай газеты „За тяжелое машиностроение". 15 сакавіка 1935 года ажаніўся ён з тамашняй ударніцай-прыгажуняй, камсамолкай Фаінай Вахравай. У снежні таго ж года нарадзіўся ў іх сын, названы на Урале Эрыкам, пазней атрымаў ён імя Цзян Сяо-вэнь. У наступным годзе пабачыла свет дачка Цзян Сяо-чжан.

Перамена

У 1936 годзе наркамам унутраных спраў Сталін назначае Мікалая Яжова — пачынаецца г.зв. Вялікі тэрор. Не абыходзіць ён і сям'і Елізаравых, неўзабаве Мікалай Елізараў апынаецца ў арышце; магчыма, з-за блізкага знаёмства з Львом Авербахам, шваграм скінутага з пасады Генрыха Ягоды...

У 1937 годзе ўспыхае кітайска-японская вайна, якая нанава яднае варожых да гэтага часу кітайскіх, падпарадкаваных Маскве, камуністаў з Гамінданам Чан Кай-шы. І гэта, мабыць, ратуе Мікалая Елізарава — сына Чан Кай-шы — ад верагоднага расстрэлу. З разлікам на палітычную інтрыгу Сталін пасылае руплівага калектывізатара Мікалая Елізарава разам з сям'ёй у Кітай. Але арышт рупліўца быў для яго і вялікім шокам, і азарэннем. Пасля перасячэння савецка-кітайскай мяжы 25 сакавіка 1937 года Мікалай Елізараў, цяпер ужо Цзянь Цын-го, адварочваецца да Сталіна спіной...

Маладая сям'я напраўляецца спачатку на сустрэчу з Чан Кай-шы і ягонай тадышняй жонкай Сун Мэй-лінь, а пасля, у канцы красавіка, у правінцыю Чжэцзян (на поўдзень ад Шанхая) да першай жонкі Чан Кай-шы Мао Фу-мэй, дзе адбываецца паўторны шлюб маладой пары, цяпер паводле кітайскага абраду. Фаіна прымае прозвішча мужа і атрымлівае імя Фан-лян (фан, па-кітайску — сумленная, лян — дабрадзейная). У родным доме мужа Фан-лян вучыцца ў свякрухі кітайскай мове, дапамагае ёй, вучыцца кітайскага ладу жыцця. У іх складваюцца вельмі добрыя адносіны, Фан-лян зноў адчувае мацярынскую цеплыню. Аднак гэтыя шчаслівыя хвіліны неўзабаве канчаюцца, у выніку японскага наступлення сужонства эвакуіруецца далей на захад, у правінцыю Цзянсі, пазней, у ходзе грамадзянскай вайны, сям'я пераязджае ў штораз новыя месцы. А Мао Фу-мэй гіне ў час японскай бамбёжкі ў 1939 годзе...

Вайна, гэта не сямейная ідылія, Фан-лян з дзяцьмі астаецца ў тыле, а Цын-го падаецца бліжэй фронту. Разлука зводзіць былога загадчыка калгаса з іншай жанчынай, якая ў 1941 годзе родзіць яму двух хлопцаў-блізнюкоў. Любоўніца, аднак, памірае ў наступным годзе і Цын-го вяртаецца да жонкі, да сям'і. У Чунціне, у правінцыі Сычуань, Фан-лян родзіць у 1945 годзе чарговага, другога сына Сяо-ву, а тры гады пазней, у Шанхаі, трэцяга сына Сяо-юн. У канцы красавіка 1949 года Фан-лян разам з дзяцьмі пераязджае на Тайвань, яе муж астаецца ў кантынентальным Кітаі з ягоным бацькам ваяваць супраць наступлення бальшавікоў Мао Цэ-дуна. 10 снежня 1949 года са свайго апошняга бастыёна ў сычуаньскім Чэнду на Тайвань эвакуіраваліся і Чан Кай-шы з сынам.

На Тайване Цзянь Цын-го займаецца дзяржаўнымі справамі. Чан Кай-шы, які пасля вяртання „блуднага" сына з дванаццацігадовай прыгоды ў Савецкім Саюзе пачаткова адносіўся да яго з недаверам, у 1950 годзе назначае яго загадчыкам сакрэтнай паліцыі, пазней, у 1965 годзе міністрам абароны і, на канец, у 1972 годзе прэм'ер-міністрам Тайваня. Фан-лян жа прысвячае свой час выхаванню дзяцей. Спазнаўшы сірочы лёс, яна вельмі беражная да сваіх дзяцей, весяліла іх, апранала, а калі каторае захварэла, кругласутачна дзяжурыла пры пасцелі. А калі яны, бывала, занадта пашалелі і іхні бацька браўся за традыцыйныя, не толькі ў кітайскім абычаі, дысцыплінарныя сродкі, маці зараз заступалася за іх, каб не пацярпелі празмернай крыўды. Але найчасцей у сям'і царылі радасць і згода. Цын-го, хаця быў вельмі заняты дзяржаўнымі абавязкамі, ніколі не забываў пра важныя гадавіны, асабліва адзначаліся ў іх доме сакавіцкія гадавіны іхняга шлюбу.

Першая лэдзі

У 1975 годзе памірае Чан Кай-шы, а ў 1978 годзе адбываюцца чарговыя прэзідэнцкія выбары, у выніку якіх прэзідэнтам Тайваня становіцца колішні кватарант Ленінавай сястры і пільны вучань Сталіна, былы загадчык савецкага калгаса, у ранейшай іпастасі Мікалай Уладзіміравіч Елізараў, у новай — Цзян Цын-го, сын Чан Кай-шы. Цын-го паказвае сябе выдатным гаспадарнікам і грамадскім лідарам, у ягоны час тайваньская эканоміка паказвае рэкордныя тэмпы росту, расце дабрабыт насельніцтва, пашыраюцца грамадзянскія свабоды, да ўлады дапускаюцца тайваньскія аўтахтоны... Цзян Цын-го выходзіць на афіцыйныя перадавіцы. А якое месца займае Фан-лян, ягоная жонка?

Свякруха Фан-лян, Сун Мэй-лінь, была баявітай жанчынай. Дзевяць гадоў вучылася яна ў прэстыжных амерыканскіх школах, вывучаючы літаратуру і філасофію. У 1927 годзе яна разарвала сужонства Чан Кай-шы з Мао Фу-мэй. Пасля займала важныя дзяржаўныя пасады, была, м.інш. міністрам авіяцыі ў свайго мужа, актыўна хадайнічала за ягоныя палітычныя інтарэсы. Пасля ягонай смерці выехала ў ЗША, дзе памерла ва ўзросце 106 гадоў. Яшчэ смялей паводзіла сябе „царыца" Манголіі Анастасія Філатава-Цэдэнбал, якая трымала пад каблуком не толькі свайго мужа...

Фан-лян трымалася інакш; яна ўдзельнічала ў афіцыйных урачыстасцях толькі тады, калі гэтага патрабаваў пратакол. І заўсёды трымалася здалёк ад першапланавых месц. Магчыма было так таму, што яна была выхадцам з іншага свету, чым кампанейства тайваньскіх палітычных вярхоў... А можа яна трымалася з краю зыходзячы са свайго нацыянальнага атавізму, так як пазней зрабіла гэта яшчэ больш радыкальна і Галіна Радыёнаўна Жаўняровічанка-Лукашэнка...

Цзян Фан-лян трымалася ўласцівай кітайскай традыцыі ценявой ролі жонкі палітычнага лідара. Больш таго, яна не выручалася прыслугай у хатніх работах, сама плаціла рахункі за хатнія расходы, хаця яны падлягалі казённаму фінансаванню. Пра ўсе выдаткі пытала дазволу ў свайго мужа. У час пахавання Чан Кай-шы спытала яна мужа, ці можа пацалаваць бацьку; было гэта незвычайнае для тамашняга этыкету развітанне нявесткі са свёкрам, які спачатку да яе ставіўся насцярожана, а пасля вельмі палюбіў...

Два іхнія сыны і дачка падаліся вучыцца ў ЗША, адзін сын у ФРГ. Цзян Фан-лян трымаецца дому, няспынна клапоцячыся пра сямейны ачаг; толькі тройчы выязджала яна з Тайваня за мяжу — у ЗША, наведаць сем'і сваіх дзяцей.

Эпілог

13 студзеня 1988 года памёр прэзідэнт Цзян Цын-го. Неўзабаве паміраюць і ўсе тры сыны Фан-лян: у 1989 годзе Сяо-вэнь, у 1991 годзе Сяо-ву і ў 1996 годзе Сяо-юн. Да Фан-лян зноў вяртаецца сіроцтва, самота, яна зусім адмаўляецца ад усялякага кампанейства.

У 1992 годзе ў Тайбэй прыязджае мінская дэлегацыя — мэр Аляксандр Герасіменка і віцэ-мэр Пётр Нікіценка — дзеля заключэння пабрацімскіх сувязей з тайваньскай сталіцай. Перад ад'ездам з Беларусі прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч падказвае ім наведаць сваю супляменніцу... Спачатку гаспадары адмаўляюць, тлумачачы, што Цзян Фан-лян у жалобе і нікога не прымае — нядаўна яна адмовіла прыёму мэру Масквы. Але ўсё ж такі пазванілі ёй, запыталі. І Фан-лян згадзілася прыняць гасцей з далёкай Бацькаўшчыны...

Гутарка за печывам, чаем, кавай і сокамі, прадбачаная на дваццаць хвілін, зацягнулася да гадзіны. Гаспадыня, нягледзячы на ейныя 76 гадоў, трымалася элегантна. Падарыла яна гасцям нацыянальныя кітайскія сувеніры, а госці ёй ільняную ляльку, аржаны хлеб і бел-чырвона-белы сцяжок — яна вельмі расчулілася...

Памерла Цзян Фан-лян 15 снежня 2004 года. У яе пахаванні ўдзельнічалі найважнейшыя дзяржаўныя чыны, урна з ейнымі астанкамі была накрыта дзяржаўным сцягам Рэспублікі Кітай на Тайване. Папялушцы з эміграцыйнай беларускай сям'і выпаў каралеўскі лёс, які — сумленная і дабрадзейная — Фан-лян вельмі сумленна і дастойна скарыстала.

1 ☞працяг года абавязваў увесь час. Царква была такой, якой яе хацела бачыць улада. І яна акрэслівала яе характар. Так вось з моцы закону можна было вымагаць ад духоўнікаў акрэсленыя паводзіны. Калі б не было епіскапа Савы, быў бы хто іншы і адыгрываў бы падобную ролю. У прэсавых матэрыялах ёсць інфармацыя, што мітрапаліт складваў характарыстыкі паасобных духоўных, якія, мабыць, у нейкі спосаб былі выкарыстаныя. Хтось аднак раней склаў такія інфармацыі аб ім. Улада заўсёды распараджаецца апаратам, які ёй дае павальную перавагу над грамадзянінам. Палітычная паліцыя, якая з'яўляецца часткай гэтага апарату ў рамках выконвання руціннай працы, праз канфідэнтаў заўсёды шукае слабых бакоў патэнцыянальных ахвяр. Такія ж былі дзеянні і ў выпадку праваслаўных духоўных. Варта звярнуць увагу на тое, што Каталіцкі касцёл у Польшчы, які быў часткай магутнай, сусветнай імперыі, не пазбег падобных праблем. Аказваецца, што нават прадстаўнікоў гэтай магутнай імперыі дзяржаўны апарат здолеў зламаць.

У чалавека, якога загнаў у тупік дзяржаўны апарат, малыя шанцы выйсці цэлым з такой канфрантацыі. Заадно ў II РП, як ПНР былі гады, калі сістэма даносаў была даведзеная да паранойі. У прынцыпе ў такой сітуацыі дзейнічала на шкоду публічнага інтарэсу і самой дзяржавы. Вырашальнікі ніколі не атрымліваюць інфармацыі аб рэальным стане, а аб шматкроць перабольшаных пагрозах. Назіраючы на падставе дакументаў за дзеяннямі апарату ПНР у адносінах да нацыянальных меншасцей, я мог прасачыць, напрыклад, як справаздача канфідэнта з размовы двух п'яных украінскіх сялян, з сантыментам успамінаючых час УПА, вырасла на нейкім этапе службовай перадачы да рангу змовы пагражаючай інтарэсам дзяржавы. Канчактовыя высновы не мелі нічога супольнага са зместам пачутым канфідэнтам. Апарат заўсёды меў схільнасць да перабольшвання пагрозы. Апарат заўсёды выяўляе пагрозы. Чым яны мацнейшыя, паяўляюцца аргументы для павелічэння штатаў, бюджэту, абслуга г.зв. бяспекі ўзрастае. Прыходзяць новыя людзі і хочуць паказаць, што яны патрэбныя. Перабольшваюцца тады чарговыя пагрозы. Гэтая саманаводная машына адраджаецца як гідра, дзе кожны функцыянер хоча даказаць, што ён патрэбны. Службы бяспекі самі ствараюць вобраз усёахопліваючых пагроз, намнажаюць іпастасі, якія акрэсліваюць як варожыя дзяржаўным інтарэсам і рупліва стараюцца, каб такое выраджанае адлюстраванне было бачанае публічнымі вырашальнікамі як рэчаіснасць. Я ніяк не магу зразумець, нашто службам бяспекі былі патрэбныя ўсе праваслаўныя епіскапы ў ролі тайных супрацоўнікаў. Дастаткова было б нейкага пісакі, епіскапскага шафёра для інфармавання, што адбываецца ў Царкве! Дзяржаўныя вырашальнікі хацелі, аднак, мець Царкву зламанай і апошленай. Прыгадваю, што гаворка тут аб установе поўнасцю адабраючай існуючы ў той час праўнапалітычны парадак. Ці ў логіцы паводзін улад можна дашукацца якога-небудзь дзяржаўнага інтарэсу?..

Да тэмы вернемся.

Падзерліся за „рускіх"!

Намаўляла я знаёмага каталіка пайсці на экумэнічнае набажэнства ў Беластоку.

— Пра што ты гаворыш! — абурыўся ён. — Пакажы мне хоць адзін экуменічны прыклад у Беластоку, то тады пайду.

На багаслужбу, якая адбывалася вечарам 19 студзеня г.г. у Свята-Духаўскай царкве, з'явілася прыстойная колькасць вернікаў розных канфесій. Калі на месцы аказалася, што багаслужба пачнецца на гадзіну пазней, чым інфармавалі медыі, частка з іх вярнулася дамоў. Не з'явіўся асабіста і беластоцкі мітрапаліт Эдвард Азароўскі. Каталіцкі іерарх меў якраз важную сустрэчу ў Варшаве (заступаў яго ксёндз доктар Радаслаў Кімша)

— Jeszcze nigdy w historii naszej cerkwi nie było tak źle! — сказаў у час прывітальнага слова настаяцель Свята-Духаўскай парафіі а. мітрат Юры Барэчка. Хоць пайшла гутарка пра сучасныя войны і праслед хрысціян, адчувалася намёк у бок люстрацыі ў Праваслаўнай царкве...

Супольнае набажэнства, прысутнасць духавенства з Грэцыі, прыгожыя словы свецкіх айцоў горада, прафесіяналізм прыхадскога і акадэмічнага хароў усё ж збудавалі ўзнёслы і малітоўны настрой сустрэчы.

Экуменічны дух набажэнства грэў і мацаваў яшчэ з дзесяць хвілін... У аўтобусе № 9, на якім я дабіралася ў цэнтр Беластока, чакаў своеасаблівы рэгіянальны каментарый. Раптам, невядома з-за чаго, у аўтобусе ўспыхла дзікая бойка. На чарнявага маладзёна знянацку накінуўся з кулакамі асобень з перабітым носам. Тып, апрануты ў элегантны капот і кепку, выглядаў быццам які палітык. Як пасля аказалася, натхненнем для рукапрыкладства паслужыла нянавісць да *рускіх*. Менавіта на гэтай мове маладзён адказаў на зачэпку нахабы.

— Co mi tu k... po rusku gadasz! — урэзаў ён у твар маладзёна.

— Ja jeb... ruskich... — бараніўся атакаваны хлапец, — Ja z Czeczenii...

Большасць пасажыраў, якая, як і я, вярталася з экуменічнага набажэнства, пасунулася ў бок шафёра, каб сысці на найбліжэйшым прыпынку...

Чытач, мабыць, цікавы як скончылася гэтая разборка. Не ведаю. Я таксама пакінула аўтобус з большасцю пасажыраў. Праўда, у момант калі чачэнец прымаў удары хацелася яго бараніць. Пасля калі ў яго ўступіла прага вайны і выглядала, што не даруе знявагі, жанчына магла адно пашкодзіць мусульманскамку байцу ў справядлівым рэваншы.

Аднак пасля гэтай сцэны я ўсведаміла сабе чаму чачэнцы мала калі ў адзіночку выходзяць вечарам на вуліцы Беластока.

(гак)

Культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа немагчыма ўявіць без творчасці Янкі Купалы. Менавіта ён — адзін са стаўпоў, на якім доўгія гады „трымалася" беларуская савецкая літаратура. Нягледзячы на даволі складаныя адносіны з гэтай самай савецкай уладай, якая ледзьве не давяла яго да самагубства (па некаторых звестках, менавіта самагубства і стала прычынай ягонай смерці), ён, тым не менш, застаўся ў памяці нашчадкаў паэтам, які быў арганічным яе складнікам.

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы існуе ўжо больш за паўстагоддзя, чаго нельга сказаць аб сайце, які распавядае як аб музеі, так і аб экспазіцыях у ягоных філіялах. З'яўленне сайта адбылося, згодна з пададзенай інфармацыяй, у 2006 годзе. А знаходзіцца ён па адрасе http://litmuseums.iatp.by/kupala/by/.

Купалаўскі музейны сайт выкананы ў даволі простай, традыцыйнай форме. Ён падзелены на дзве часткі. У левай, вузейшай, месцяцца выйсці на розныя рубрыкі. Праўда, тут выяўляецца невялікая недарэчнасць — вынік сённяшняга заняпаду беларускай мовы ў Беларусі. Рубрыка „Гістарычная даведка", якая ідзе другой зверху, чамусьці носіць назву „Гістарычная спраўка". Для сайта слыннага беларускага песняра гэта недаравальна.

Што ж тычыцца зместу гістарычнай рубрыкі, то ён даволі поўна адлюстроўвае падзеі, звязаныя з развіццём музея. „Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы быў створаны 25.05.1944 г. пры АН БССР па пастанове Савета народных камісараў і ЦК КП(б) Беларусі, адкрыты для наведвання 20.09.1945 г. У 1944 г. пад музей быў адведзены трэці паверх у Доме прафсаюзаў (пл. Волі, 23). Тут да 20 верасня 1945 г. была створана выстаўка аб жыцці і дзейнасці Янкі Купалы, што дало магчымасць адкрыць музей для наведвальнікаў", — распавядаюць аб моманце з'яўлення музея аўтары сайта.

Цікавым з'яўляецца апісанне калекцый, якімі валодае музей. Яны сістэматызаваны па часе і тэмах. Сярод іх — зборы даваенных твораў Купалы, фотаздымкі, мемуары і, нават, кінарахіў.

Адной з найбольш насычаных інфармацыяй старонак сайта аб купалаўскім музеі ў Мінску можна лічыць „Апісанне экспазіцыі". Зразумела, яно не такое вялікае і падрабязнае, што касуе патрэбу ў фізічным наведванні музея, але, тым не менш, зацікаўлівае і падштурхоўвае прайсціся па музейных залах. Тым больш, што яна мусіць у недалёкім часе абнавіцца. „У сувязі з атрыманнем новых матэрыялаў з гасцініцы „Масква", дзе трагічна абарвалася жыццё Купалы, мяркуецца аднаўленне асобных экспазіцыйных комплексаў", — паведамляецца на сайце.

Літаратурны музей Янкі Купалы мае чатыры філіялы. Яны носяць назвы „Вязынка", „Ляўкі", „Акопы" і „Яхімоўшчына". Гэта тыя мясціны, якія так ці інакш звязаныя з жыццём і творчасцю паэта. Вязынка — гэта малая радзіма Янкі Купалы; Ляўкі — месца, дзе месцілася дача паэта і дзе ён праводзіў шмат часу; сядзібу Акопы (вёска Харужанцы) калісьці арандавала маці літаратара Бянігна Іванаўна Луцэвіч акурат сто гадоў таму, а ў Яхімоўшчыне малады тады паэт працаваў на бровары. Аб кожным з філіялаў на сайце змешчаны падрабязны расповед.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Дуплет ДД

Другі спартовы выпуск запар мусім прысвяціць біятлону і вялікаму тэнісу. Прычынай таму дзве дзяўчыны — Дар'я Домрачава і Вікторыя Азаранка, якія практычна ў адзіночку змагаюцца за гонар беларускага спорту ў сваіх відах.

Апошні этап Кубка свету па біятлоне перад першынством планеты прайшоў у італьянскай Антэрсельве (часта гэты горад на мяжы з Аўстрыяй называюць таксама па-нямецку Антхольц). Адразу два медалі, выстраліўшы дуплетам, здабыла на ім Дар'я Домрачава, якая праўдападобна выйшла на пік сваёй гатовасці. Спрынтарская гонка прынесла нашай біятланістцы першае серабро ў асабістай кар'еры на спаборніцтвах такога роўню. Домрачава спакваля ішла да гэтага поспеху і хочацца спадзявацца, што пік формы прыпадзе якраз на чэмпіянат свету. У акрэсленым спрынце Дар'я пры першай стральбе аднойчы не трапіла ў мішэнь і пасля гэтага рубяжа ішла толькі 31-й. Але добрая лыжная падрыхтоўка дазволіла ёй істотна паправіць сітуацыю. А пасля бездакорнай стральбы стоячы здолела нават выйсці ў лідары. У выніку лепшага за яе часу змагла дасягнуць толькі нарвежка Тура Бергер. Пасля гэтай гонкі ў агульным заліку спрынтарскіх гонак Домрачава выйшла на трэцюю пазіцыю і зусім не шмат саступае расіянкам Юр'евай і Сляпцовай.

На наступную гонку перасследу ДД выйшла ўжо ў ролі адной з фаварытак. На чатырох стралковых рубяжах беларуска памылілася двойчы, у выніку саступіўшы пераможцы Анне Булыгінай з Расеі толькі 2,3 секунды. Такі ж вынік як і Домрачава паказала фінка Кайса Макарайнен, але фотафініш адвёў ёй сярэбраную ўзнагароду. Яшчэ адна прадстаўніца нашай краіны Вольга Кудрашова стала 14-й. Усяго стартавала 57 удзельніц. А ў апошні дзень этапу прайшлі гонкі так званага масстарту. У мужчын на адлегласці 15 км. Рустам Валіулін стаў дваццатым. Ад пераможцы немца Крыстафа Штэфана ён адстаў на 1 хвіліну 43 секунды. Усяго стартавалі 30 мацнейшых біятланістаў. У жаночым масстарце на 12,5 кіламэтра Дар'я Домрачава на гэты раз выступіла няўдала. Шэсць разоў яна не трапіла ў мішэнь і стала толькі 21-й. У іншых нашых выніках яшчэ горшыя — Вольга Кудрашова ў выніковым пратаколе 24-я, Надзея Скардзіна — 28-я.

Працягвае прагрэсаваць на сур'ёзных турнірах і тэнісістка Вікторыя Азаранка. Толькі, на жаль, яна схільная да частых траўмаў і захворванняў. Вось і на Australian Open Вікторыя была змушана завяршыць свае выступы ў адзіночным разрадзе датэрмінова. А ішло ўсё вельмі перспектыўна. Адолеўшы ў першых двух раўндах менш рэйтынгавых саперніц, у трэцім крузе Азаранка выйшла на некалі грозную Амелі Марэсмо з Францыі. І перамагла яе досыць упэўнена — 6:4 і 6:2. У наступным раўндзе — 1/8-й фіналу — саперніцай Азаранкі стала другая ракетка свету амерыканка Серэна Уільямс. Першы сет запісала ў свой актыў беларуска — 6:3. А далей здарылася неспадзяванае. Пры ліку 2:4 у другой партыі Вікторыя ўзяла медыцынскі таймаўт, пасля чаго знялася з турніру па прычыне кепскага самаадчування. На момант напісання гэтых радкоў было невядома, ці зможа Азаранка прадоўжыць свае выступы ў парным разрадзе, дзе яна разам з расіянкай Верай Званаровай упэўнена ішла па турнірнай сетцы, аформіўшы пропуск у 1/8-ую фіналу. Астатнія беларускія прадстаўнікі на адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі выбылі на ранніх стадыях.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

XV сесія Рады гміны ў Чаромсе

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

29 снежня 2008 г. у Чаромхаўскім асяродку культуры адбылася XV сесія Рады гміны, на якой разглядаліся, між іншым, справаздача войта з дзейнасці гміны, уручэнне падарункаў ганаровым донарам, інфармацыя аб рэалізацыі задач у сферы фінансавай гаспадаркі, інтэрпеляцыі радных, зацвярджэнне бюджэту гміны на 2009 год і разгляд скарг жыхароў на войта.

Першым голас узяў войт Міхал Врублеўскі. Паінфармаваў ён Раду аб важнейшых сваіх рашэннях, якія тычыліся сацыяльных спраў, гаспадаркі другаснай сыравінай, продажы жылых кватэр і сельскагаспадарчых участкаў ды іншых пытаннях.

Удзельнікі XV сесіі Рады гміны ў Чаромсе

— Дадатковым харчаваннем, — сказаў войт, — пакарысталася 146 дзетак пачатковай школы, гімназіі, звышгімназічных школ і прадшколля і гміна на гэтую мэту прызначыла 14 033 злотых; 12 асоб атрымала сталую дапамогу — 24 выплаты на суму 6 794 зл.; 42 сем'ям прызначана была часовая дапамога — 23 794 зл.; аднаразовую грашовую дапамогу на закуп вопраткі, харчовых прадуктаў і лякарстваў атрымалі 73 асобы — разам 9 051 зл.; сямейную дапамогу на суму 108 567 зл. атрымала 358 падапечных. 4 маці была выплачана аднаразовая дапамога (па 1000 зл.) з нагоды нараджэння дзіцяці (г.зв. „бэціковае"); 22 сем'ям выплачана 44 грашовыя дапамогі з аліментацыйнага фонду на суму 14 859 зл; 30 сем'яў пакарыстаецца сумарнай кватэрнай даплатай — у сярэднім 2 400 зл. у месяц; 17 сем'яў атрымала 4 800 зл. на закуп харчавання. Апрача вышэйпаказанага было выдадзеных 6 пастаноў аб пагашэнні падаходнага падатку па просьбе даўжнікоў і 5 такіх жа пастаноў па ініцыятыве адміністрацыйнага органа. Гміна прадала 1 440 кг „моцнай" (кардон) і 590 кг газетнай макулатуры і атрымала за гэта 175,50 зл.; 620 кг фольгавай упакоўкі — 158 зл.; 1620 кг шклатары — 163 зл. Прададзены былі дзве кватэры: па вуліцы Школьнай — за 38 600 зл. і 1 Мая — за 32 931 зл.

Варта адзначыць, што Разліковай палатай быў праведзены комплексны кантроль, які не выявіў хібаў у дзейнасці гміннага самаўрада. За гэта кіраўнікам паасобных службовых адзінак, як і супрацоўнічаючым з гмінай установам шчырае дзякуй сказаў войт Міхал Врублеўскі.

Па прапанове Рэгіянальнага праўлення Польскага чырвонага крыжа былі ўручаны падарункі ганаровым донарам. У час інтэрпеляцый радны Ежы Сціхура крануў праблему частага выключання электратоку на сямятыцкай лініі (ды не толькі на гэтай). Краналася справа ўстанаўлення банкамата, як і пабудовы дарогі ў Янцэвічы. Радныя скардзіліся, што ў святочныя дні за выплатай пры дапамозе банкаматнай картачкі трэба падавацца ў Гайнаўку, бо чаромхаўскі банк закрыты, ды і ў буднія дні часта да касы выстройваюцца чэргі. Наконт банкамата войт заявіў, што службовае пісьмо ўжо пададзена ў Гайнаўскае адзяленне ПКО і трэба чакаць рашэння. На думку войта, можна спадзявацца станоўчага рэзультату. Кіраўнік сектара камунальнай і дарожнай гаспадаркі Крыстына Мішчук адказала раднаму Сціхуру, што выключэнні электратоку выкліканы ўстарэлай электралініяй і аварыямі. Прадпрыемства энергетыкі праводзіць комплексную кансервацыю і намагаецца, па меры магчымасці, пазбягаць непрадбачаных выключэнняў.

З пабудовай дарогі ў Янцэвічы войт не бачыць праблемы таму, што грошы ўжо прызначаны і з пачаткам вясны пачнецца мадэрнізацыя дарогі.

Радныя прынялі пастанову аб бюджэце на 2009 год. На баку даходаў запісана 13 928 754 зл., а на баку выдаткаў — 17 428 754 зл. Дэфіцыт (тры з паловай мільёна злотых) будзе рэалізаваны з банкавага крэдыту. Пастанова была прынята аднагалосна чатырнаццаццю раднымі. У час галасавання многія супярэчнасці выклікалі пастановы аб прасторавым добраўпарадкаванні гміны, якой праект меў шмат хібаў. Таму, па прапанове раднага Сціхуры, пасля бурлівай дыскусіі Рада рашыла гэты праект адаслаць на паўторны разгляд камісіі. У далейшай частцы павесткі дня былі разгледжаны скаргі Гражыны Радзікоўскай і Яўгена Тыханюка на войта гміны. Радныя ў абодвух выпадках прызналі скаргі неабгрунтаванымі, хоць у гэтай справе не было аднадумнасці.

У вольных пытаннях радны Міраслаў Лук'янюк, карыстаючыся прысутнасцю каменданта Пагранічнай аховы, папрасіў пазнаёміць удзельнікаў сесіі са справай мадэрнізацыі пагранперахода Полаўцы — Пяшчатка. Па ацэнцы камандзіра пагранічнікаў на зломе мая і чэрвеня будзе здадзена ў карыстанне новазбудаваная застава і пачнецца мадэрнізацыя дарожнага пагранічнага перахода ў Полаўцах — Пяшчатцы. Як паінфармаваў у час люстрацыі пагранперахода на месцы шэф Сеймавай камісіі адміністрацыі і ўнутраных спраў Марэк Бярнацкі, неабходныя фінансавыя сродкі адведзены ў цэнтральным бюджэце і трэба быць добрай думкі, што неўзабаве пачнуцца работы. Пад пераход выдзелены ўчастак плошчай у чатырнаццаць гектараў. Будзе дванаццаць палос дарожнага руху. Занятых пры будове будзе каля сотні рабочых. Навінкай мае быць паласа пешага руху, але гэта ў большай частцы залежаць будзе ад беларускага боку. Паскорыцца прытым мытны і пагранічны кантроль на новым суперсучасным пагранпераходзе, — завяршыў выступленне камендант Пагранічнай аховы.

У заканчэнні пасяджэння войт павіншаваў радных з Новым годам і пачаставаў чаркай шампанскага.

Усяночная ў Ласінцы

Фота АНДРЭЯ ЯЛОЗЫ

Айцец Георгій Кос здзяйсняе чын мірапамазання

З даўніх часоў кожны год людзі чакалі, каб перад кожным святам Ражджаства Хрыстовага пачуць такія вось словы: „Бог ёсць любоў, і хто жыве ў любові, той жыве ў Богу, і Бог у ім". Гэтыя жыватворныя словы нясуць святло, так як і віфлеемская зорка. Бог Праўды і Любові — гэта адзіны Бог, які не мае нічога супольнага з багамі хлусні і нянавісці.

Ласінскія прыхаджане, а таксама частка мясцовых каталікоў, чакалі надыходу свята Ражджаства Хрыстовага. Так як і ў мінулых гадах у царкве св. Іакава ў Ласінцы прыхаджанамі, пад кірункам настаяцеля а. Георгія Коса, быў наведзены ідэальны парадак. Святочна выглядала царква як унутры, так і звонку. Асабліва прыгожа прэзентуецца падсветлены храм ноччу.

Нягледзячы на моцны мароз, на ўзгорку каля царквы перад другой гадзінай ночы пачаўся ажыўлены рух. Сталі з'язджацца прыхаджане са сваімі гасцямі. Каляднае багаслужэнне пачалося а другой гадзіне з Усяночнага дбання. Літургію служылі а. Георгій Кос і а. Аляксей Кулік у суправаджэнні трох прыхадскіх хароў — двух дзіцячых і дарослага. На заканчэнне багаслужбы а. Георгій Кос павіншаваў прыхаджан з Калядамі і падзякаваў ім за прыбыццё, наперакор неспрыяльнаму надвор'ю.

Андрэй ЯЛОЗА

Адгаданка

1. Пятрусь, беларускі паэт (1905-80), 2. працяглая адсутнасць дажджоў, якая прыводзіць да перасыхання глебы і гібелі расліннасці, 3. дзяржава з Шанхаем, 4. паўднёвае вечназялёнае дрэва (Cupressus), 5. вярхоўны старажытнагрэчаскі бог, 6. блакіт над зямлёй, 7. не рука, 8. сярдзіты зімовы месяц.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — іспанская пагаворка.

(ш)

		1					2
	3						
	4						
		5			6		
					7	8	

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 52 нумара

Атыт, Аўеда, веер, дзюна, ёд, мезазой, меса, мох, тона, Юхо.

Рашэнне: **Хто здаровы, той мае надзею, а хто мае надзею, мае ўсё.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

Музыка жыцця і Эндзі Уорхал (2)

Фота і тэкст ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У мастацтве Эндзі Уорхала найперш цікавіць мяне сам Эндзі Уорхал. Яго асоба па сённяшні дзень выклікае супярэчныя каментарыі. Для адных ён падманшчык і цынічны ігрок на рынку мастацтва, для ішншых — прарок і жывое ўвасабленне мастацтва другой паловы XX века. Паколькі мастака няма ў жывых ужо дваццаць адзін год, у мяне не было асаблівых спадзяванняў, калі разам з Асяй і трохтыднёвай Марыяй (яна нарадзілася ў дзень адкрыцця выстаўкі) выправіліся ў арт-музей. З другога боку, грэх абмінуць сустрэчу са сваім героем ды паназіраць як скрыжаваліся славянска-карпацкія і амерыканскія перспектывы ў люстры часу, падгледзець, што цікавае канадскаму гледачу, звабленаму найперш медыйным шумам. Сапраўды, раней я нідзе не сустрэла такой рэкламы культурнага мерапрыемства (у маёй вёсцы апошні сказ пракаментавалі б: „Дэ ты была! Што ты бачыла!”). Так ці інакш у Манрэалі запрашалі на выстаўку шматгучным хорам у газетах і па тэлебачанні, на відэакарцінах у метро і кавярнях, у кнігарнях і на вулічных білбордах...

Я, дарэчы, забылася, што сустрэчы з літаратурнымі героямі бываюць непрадказальнымі!

* * *

Незвычайнымі і нечаканымі паказаліся мне натоўпы ў арт-музеі ў будзённы дзень. Каб дастаць білет (30 долараў ад асобы) трэба было хвілін пятнаццаць стаяць у чарзе. Калі мы пасля вандравалі па паасобных выставачных залах-лабірынтах, паток наведвальнікаў толькі пашыраўся, каб у канцы, на падвядзенне ўражанняў, зліцца гучнай гурбой у музейнай арт-краме. Сіла „Warhol Live” — ва ўнушальнай атмасферы, якая нараджаецца паступова, у час перасякання паасобных залаў, прымеркаваных да этапаў і важнейшых момантаў у шалёным жыцці мастака. Гэты нюанс выдатна скарыстаны ў камерцыйным сэнсе. Разахвочаны і падбадзёраны глядач пакідае ў краме чарговыя дзесяткі або і сотні долараў. На камерцыйны поспех выдатна спрацоўвае забарона фатаграфаваць і здымаць фільмы ў выставачных залах. Прага набыць абышто, хоць бы пластмасавую талерку фабрычнай вытворчасці за 50 долараў, выглядала як насмешлівы арт-каментарый, прыдуманы самім Эндзі Уорхалам.

* * *

Спачатку я сумнявалася ці ў такім натоўпе ўбачу і зразумею ідэю выстаўкі. Тут пра ўсё меў сказаць сам загаловак: „Музыка і танец у жыцці і творчасці Эндзі Уорхала”. Музычныя захапленні мастака прадстаўлены ў храналагічным парадку, з моладзевага зачаравання фільмавай музыкай па легендарную дыскатэку на сцэне „Студыі-54”, дзе праводзіў свае бяссонныя ночы да апошніх гадоў жыцця. Выстаўку складаюць 640 твораў, сярод якіх карціны, фатаграфіі, дызайн, інсталяцыі, фільмы, прадметы і дакументы з прыватнага архіва Уорхалаў. Усе творы ствараюць дынамічную і адначасова абсурдную кампазіцыю. Вось разам з сабой супастаўлены карціны-іконы поп-зорак, напрыклад, „Elvis”, „Marilyn”, „Liza Minelli”, „Grace Jones”, „Mick Jagger” з ардынарай выявай „Campbell’s Soup Cans”. Музычная прэзентацыя дапасаваная ў часе да поп-іканаграфіі. Вандруючы яе следам, мы пабачым музычныя густы пасляваеннай Амерыкі — з класікі па джаз, рок, поп, соўл, дыска і гіп-гоп. Вядома, самае вялікае галавакружэнне чакала ў залах, уладжаных пад легендарную Сярэбраную фабрыку (Silver Factory), ад прасякнутай дымам наркотыкаў атмасферы і дэструкцыйнай музыкі. Побач андэграўндавага гурту „Velvet Underground” прэзентуюцца пакеты з-пад пральнага парашку. Да іх прыпісаны каментарый: „Злосныя крытыкі абвінавачваюць нас у беспрадуктыўнасці нашай Фабрыкі. Хай гэты парашок паслужыць доказам нашай мастацкай прадукцыі”.

У цяні поп-зорак

У зале „Студыя-54”, сярод лабірынтаў, пазначаных галерэяй поп-зорак, чакаў мастацкі сюрпрыз. Калі я ставіла свае заўвагі ў кнігу наведвальнікаў, побач прашмыгнуў двайнік мастака. Каб не было сумненняў, што гэта *ён, Эндзі Уорхал*, азірнуўся ў наш бок. Пасля, калі я апавядала пра „вернісаж” сяброўкам карпацкага падарожжа, хтосьці трапна заўважыў: „Чаму гаворыш пра яго як жывога чалавека?”

Я злавіла сябе на фрэйдаўскай памылцы. Таму пабаялася тлумачыць, што ў канцы жыцця Эндзі Уорхал сам сябе абвясціў жывым духам.

* * *

— Для такіх эмігрантаў як я, — сказала Ася, — Эндзі Уорхал важны ў сэнсе самаразвіцця. Ён — добры прыклад, што чалавек з нашага славянска-племяннога свету не горшы за іншых у Амерыцы, што можа дабіцца поспеху, уплываць на рэчаіснасць...

Камунікацыя на племянной ноце вельмі модная ў багатай і дагледжанай Канадзе. У наваколлі ўніверсітэтаў можна сустрэць дзесяткі сучасных качэўнікаў, ідэйных паплечнікаў культуры гіпі. „Іх вобраз” найбольш запамятаўся мне ў манрэальскім, раскошна-каляровым восеньскім краявідзе. Раз, калі я вярталася з ранняй прагулкі, наткнулася на маладзенькую парачку, якая разам з сабакамі смачна драмала ў спальным мяшку проста на тратуары. Над іх логавам луналі дымкі подыхаў. Дзяўчына і хлопец спрасонку смяяліся, быццам адначасова прыснілі добры сон. Дзеці багатых і прэстыжных бацькоў, са статкам сабак (пароды лабрадор), „жывуць” проста на тратуары, сярод патоку пешаходаў. Іх дагледжаны і інтэлектуальны выгляд выклікае прызнанне і пэўную зайздрасць стомленага натоўпу. На іх глядзіцца як на сучасны твор мастацтва — жывую карціну свабоды і пачуццяў.

Сучасныя намады качуюць на вуліцах метраполій

Дарэчы, камунікацыя з натоўпам не пазбаўленая ў іх іранічнага каментарыя. Час ад часу маладыя працягвалі руку, просячы ў прахожых на „цёплую ежу для сабакі”.

01.02 — 07.02

(22.03. — 20.04.) Лёс асцерагае цябе перад небяспекай — будзь разважлівы, не ўваходзь у непатрэбныя спрэчкі. 3.02. адкрыюцца перад табой новыя магчымасці і ў асабістым, і ў прафесійным плане.

(21.04. — 21.05.) 4-8.02. папсуюцца адносіны з блізкімі. Падвергнешся небяспечным сітуацыям або возьмешся за бесперспектыўныя мерапрыемствы. З 6.02. клопаты ў падарожжы, цяжкія сітуацыі з-за асоб, якія табе не спрыяюць.

(22.05. — 22.06.) Хутка возьмешся за працу, выпрастуеш справы, папхнеш іх наперад. Многа творчых ідэй. З 6.02. хандра, благі настрой, неахвота вучыцца. Фатальны час на экзамены і сустрэчы.

(23.06. — 23.07.) Перад табою месяц поўны змен і новых выклікаў. У сферы пачуццяў найважнейшымі будуць для цябе лаяльнасць і адказнасць. Не вер людзям, якія схочуць цябе здамінаваць.

(24.07. — 23.08.) Без праблем можаш прызнацца камусь да таго, што адчуваеш. У зараблянні грошай не будзе табе роўных! Прапановы пасыплюцца як з рукава! Але будзь асцярожны — абручовае зацьменне Сонца можа выцягнуць на святло справы, да якіх ты не меў бы ахвоты прызнацца.

(24.08. — 23.09.) Знакамітая форма. З поспехам можаш брацца за любыя мерапрыемствы. Але, хоць будзе табе здавацца, што можаш перанесці горы, раптам можаш падвесці ў зусім дробным! Знайдзі пазітыўны спуск для лішку энергіі.

(24.09. — 23.10.) Твая краса і сімпатычнасць заварожаць цяпер кожнага! Уся твая энергія засяродзіцца на адносінах з людзьмі — тут можаш шмат здабыць, але і многа страціць. Не трапляй у чорную роспач, калі штосьці не ўдасца; памалу ўсё выпрастуецца! З 6.02. хтосьці схоча цябе выкарыстаць або падмануць; будзь вельмі асцярожным.

(24.10. — 22.11.) Адчуеш патрэбу грунтоўных змен у сваім жыцці. Схільнасць да неадпаведнага накіроўвання пачуццяў, ублытвання ў скандальныя афёры (4-8.02.); адчакай крытычны момант, падумай над пасляпдоўнасцямі таго, што хочаш зрабіць! Калі раманы, дык з новымі знаёмымі: не папсуй старога сяброўства!

(23.11. — 22.12.) Люты паказваецца шматабяцальна; нават калі не будзеш хадзіць у лаўрах, ніхто не перашкодзіць табе ў рэалізацыі тваіх намераў. Можаш залюбіць у сабе каго толькі схочаш! 2-6.02. будзь дальнабачным, бо зробленых у гэты час памылак не даруеш сабе і не зможаш лёгка іх паправіць!

(23.12. — 20.01.) Стрымайся з рэалізацыяй таго, на чым табе залежыць (цяжка будзе ўпільнаваць тэрміны, можаш пагубіцца з дэталямі). 5-9.02. твая інтуіцыя цябе не падвядзе, будзеш эмпатычны, усёразумеючы. Асабліва сардэчна будзе з роднымі. З 7.02. могуць пачацца ў цябе клопаты са здароўем, агульная разгубленасць.

(21.01. — 19.02.) 4.02. будзеш ведаць, як паставіць на сваім! Перапоўніць цябе такая энергія, што, незалежна ад узросту, адчуеш сябе маладым, а свет поўнасцю адкрыецца перад табою! 2-8.02. не бяры неабдумана пазык, не купляй каштоўных рэчаў (не такія яны патрэбныя, як табе здаецца!).

(20.02. — 21.03.) Ідэальны час на сустрэчы з сябрамі. Запаволь тэмп, адпачывай, не вырашай аб важным. Не стаў партнёру такіх умоў, з якімі сам не справішся! Зоркі схіляць цябе да абагульненняў і паглыблення ў самім сабе. У выбарах памогуць табе медытацыя, малітва.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960